Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 13 (512) | Субота, 29 сакавіка 1941 года | Цана 20 кап.

Асноўная задача тэатраў

Зрабіць совецкую п'есу душой тэатра, асновай рэпертуару — пярвейшая задача работнікаў совецкага тэатральнага мастацтва. Тэатр павінен быць войстрай вброяй і дзейсным памочнікам большэвіцкай партыі ў вырашэнні надзённых задач соцыялістычнага будаўніцтва, комуністычнага выхавання працоўных. Адгэтуль і вынікае патрэба пераглсду рэпертуарных планаў, карэннага павароту тэатраў да совецкай драматургіі. Совецкая п'еса — п'еса аб праблемах нашага часу, аб совецкіх людзях — будаўніках соцыялізма, аб соцыялістычнай працы, аб герэіцы абароны свяшчэнных граніц совецкай зямлі — павінна быць у цэнтры ўвагі тэатраў. Гэтых п'ес нецярпліва чакае наш глядач. Гэтыя п'есы павінны ва ўсёй прыгажосці і з усёй сілай загучаць на совецкай сцэне.

Недаравальна, што беларускія тэатры так мала звярталіся да таго багацця, якое ўжо накоплена совецкай драматургіяй, што з рэпертуару нашых вядучых тэатраў зніклі «Любоў Яравая» К. Трэнёва, «Браняпоезд 14-69» В. Іванава, «Разгром» А. Фадзеева, «Разлом» Б. Лаўрэнёва ды іншыя п'есы, якія былі і застаюцца выдатнымі творамі совецкай драматургіі. І вельмі крыўдна, што некаторыя з іх, як «Браняпоезд 14-69», паказаны гледачу ў мінулым сезоне Першым Дзяржаўным драматычным тэатрам БССР, хутка сышлі са сцэны.

Лепшы прыклад работы з драматургамі па ўзбагачэнню свайго рэпертуару арыгінальнымі творамі і работы над совецкімі п'есамі ў сёлетнім сезоне паказвае Другі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр, які паставіў ужо некалькі совецкіх п'ес, у тым ліку новы твор беларускай драматургіі — «Ірынку» К. Чорнага. У бліжэйшым будучым тэатр пакажа гледачу «Несцерку» В. Вольскага, «Анну Лучыніну» К. Трэнёва. Тэатр стала і сур'ёзна працуе з беларускімі драматургамі, трымае сувязь з радам драматургаў Масквы.

Адстае ў гэтых адносінах Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр БССР, які пасля дэкады не паставіў яшчэ ніводнай совецкай п'есы і чамусьці зацягвае пастаноўку ўключанай у яго рэпертуар «Ірынкі» К. Чорнага. Не можа задаволіць патрабаванняў гледача Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР, на сцэне якога даўно ўжо не ішлі совецкія п'есы і які так шчодра ставіць шматлікія інсцэніроўкі класічных і «поўкласічных» твораў, арыентуючыся больш на «праблемы» касы, чым на праблемы сучаснасці, на патрабаванні гледача. Заслугоўвае сур'ёзнага папроку і Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР, які ў сёлетнім сезоне не паставіў ніводнай арыгінальнай оперы, які не наладзіў патрэбнай работы з беларускімі кампазітарамі па стварэнню опер, балетаў аб нашых днях, аб сучаснасці. Адзіны новы арыгінальны твор, які ёсць у рэпертуары тэатра, — опера «Кацярына» не мае ўвагі, не ставіцца. Не клапоціцца пра арыгінальны рэпертуар і Тэатр музыкальнай камедыі БССР.

Час пераглядзець тэатрам свае ўзаемаадносіны з драматургамі, лібрэтыстамі, кампазітарамі і ўстанавіць сапраўды шчыльныя творчыя сувязі, праявіць сур'ёзныя клопаты аб стварэнні п'ес, опер на хвалюючыя тэмы сучаснасці. Разам з тым і на пастаноўку совецкіх п'ес тэатры павінны звярнуць выключную ўвагу. Лепшыя акторы павінны выконваць ролі ў совецкіх п'есах і лепшыя рэжысёры павінны ставіць іх. Хіба не марыць кожны совецкі рэжысёр і актор аб стварэнні хвалюючых вобразаў людзей нашага часу, герояў нашых вялікіх дзён! Дык трэба па-сапраўднаму змагацца за гэта. Змагацца за сапраўдны поспех, за раскрыццё акторскіх дараванняў, за сапраўднае майстэрства іменна пры пастаноўцы совецкай п'есы.

Які пераканаўчы прыклад — творчыя поспехі ў стварэнні на сцэне вобразаў вялікіх правадыроў народа Леніна і Сталіна, у стварэнні вобразаў совецкіх людзей народнымі артыстамі БССР П. Малчанавым, Д. Арловым, А. Ільінскім, творчы вопыт народнага артыста БССР Г. П. Глебава, які на стварэнні вобразаў з п'ес беларускіх драматургаў ва ўсёй велічы разгарнуў сваё дараванне і дасягнуў вялікага прызнання—удастоен Сталінскай прэміі.

Вырасла і акрэпла беларуская драматургія. Выдатнае сведчанне сталасці яе— прысуджэнне Сталінскай прэміі К. Крапіве за п'есу «Хто смяецца апошнім». У гэтым годзе ўвайшлі ў рэпертуар новыя п'есы К. Чорнага і В. Вольскага. Заканчвае работу над п'есай П. Броўка. Над новымі п'есамі працуюць, акрамя памянёных вышэй драматургаў, яшчэ рад пісьменнікаў. Вялікае значэнне павінны адыграць і дадзеныя Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР дзяржаўныя заказы групе вядучых драматургаў. Рад новых імён — маладых драматургаў — выявіў рэспубліканскі конкурс на лепшую п'есу. І з імі павінны працаваць тэатры, заахвочваючы маладых аўтараў і дапамагаючы ім. Патрэбна клапатліва расціць новыя кадры, папаўняць рады драматургаў. Павінна быць адкінута практыка арыентацыі выключна на абмежаванае кола аўтараў—на выяўленыя, зарэкамендаваўшыя сябе імёны. Не баяцца рызыкі, ахвотна і любоўна падтрымоўваць кожны пачатак работы ў драматургіі пісьменнікаў, у тым ліку і маладых,—пачэсны і надзённы абавязак Упраўлення па справах мастацтваў і тэатраў.

Патрэбна змагацца за пашырэнне тэматыкі, у першую чаргу за распрацоўку ў драматургіі тэм, адлюстроўваючых магутны рост прамысловасці, рабочага класа ў нашай рэспубліцы, сёнешняе жыццё калгаснай вёскі, у прыватнасці — народную героіку ў выкананні велічнага сталінскага планаператварэння балотаў у квітнеючыя калгасныя палі і сенажаці. Патрэбна змагацца і за разнастайнасць жанраў нашай драматургіі. І шырокія творчыя сувязі павінны ўстанавіць нашы тэатры з драматургамі Масквы, Ленінграда, усіх братніх рэспублік.

Вялікай і ўдзячнейшай задачай тэатраў рэспублікі з'яўляецца і работа над класікай. Гарачага адабрэння заслугоўвае ў гэтым ініцыятыва Першага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, які пакажа ў гэтым годзе на сваёй сцэне «Ромео і Джульетту» В. Шэкспіра, як і меркаванне раду тэатраў працаваць над драматургіяй Горкага і Чэхава. І класічныя творы павінны мець пачэснае месца ў рэпертуары тэатраў. На іх, на лепшых узорах класічнай драматургіі будзе расці і ўдасканальвацца майстэрства актораў. Яны — натхнёныя творы, выхоўваючыя любоў да радзімы,— патрэбны совецкаму гледачу, любімы ім.

Не маюць арыгінальнага рэпертуару абласныя, калгасныя тэатры рэспублікі. Асноўная віна за гэта кладзецца на кіраўнікоў гэтых тэатраў, якія не праяўляюць клопатаў і ініцыятывы ў наладжванні сувязі з драматургамі. Але і Ўпраўленне павінна па-сапраўднаму заняцца аб'яднаннем творчых сіл драматургаў вакол гэтых тэатраў, пытаннямі стварэння для гэтых тэатраў арыгінальнага рэпертуару.

Да вялікай даты ў гісторыі нашай радзімы — да 25-годдзя Вялікага Кастрычніка рыхтуецца совецкі народ, творча рыхтуюцца пісьменнікі, работнікі мастацтваў. З вялікімі поспехамі — з творамі, вартымі сталінскай эпохі, — павінна падыйсці тэатральнае мастацтва да слаўнага юбілея краіны соцыялізма. І задачы дастойнай сустрэчы 25-годдзя Совецкай улады павінны быць з гонарам вырашаны дружнай творчай работай тэатраў з драматургамі.

Больш ініцыятывы і творчага дзярзання, больш зацікаўленасці павінны праявіць тэатры — дзяржаўныя, абласныя, калгасныя — па ўстанаўленню патрэбных сувязей і наладжванню творчай работы з драматургамі. Абавязак драматургаў і работнікаў тэатральнага мастацтва Совецкай Беларусі дзейсна змагацца за ўзбагачэнне беларускай драматургіі дасканалымі, ідэйна і мастацка-поўнакаштоўнымі творамі, за майстэрскую пастаноўку гэтых твораў, як і наогул лепшых твораў совецкай драматургіі, на сцэне нашых тэатраў. Клопаты аб совецкім рэпертуары — аснова дзейнасці тэатраў.

Інфармацыйнае паведамленне

24—26 сакавіка 1941 года адбыўся чарговы Пленум ЦК КП(б) Беларусі.

Пленум заслухаў і абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Даклад намесніка старшыні СНК БССР тав. ВАНЕЕВА В. Г.—«Аб мерах па забеспячэнню плана капітальнага будаўніцтва 1941 года па БССР».

2. Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. КУЛАГІНА М. В. — «Аб мерапрыемствах па выкананню пастановы Соўнаркома Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацей».

3. Даклад наркома земляробства БССР тав. КРУПЕНЯ І. А. — «Аб правядзенні веснавой сяўбы ў 1941 годзе».

З прамовай аб задачах партыйных арганізацый Беларусі ў вырашэнні пытанняў, якія стаяць на парадку дня Пленума, выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. ПАНАМАРЭНКА П. К.

Па парадку дня Пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

Пленум таксама рашыў арганізацыйныя пытанні.

Пленум перавёў з кандыдатаў у члены ЦК КП(б)Б — у члены ЦК КП(б)Б таварышоў: ГАРБУНОВА Т. С., ЧОРНАГА І. Л., ГАЙСІНА В. Б., КУДРАЕВА В. Г., ЛЯВІЦКАГА П. А., БАНДАРЭНКА П. В., МІСЮРАВА А. П., ЭЛЬМАНА А. П. і КУРГАНА І. М.

Пленум выбраў сакратарамі ЦК КП(б)Б па прамысловасці тав. ЭЙДЗІНАВА Г. Б. і тав. МАЛІНА В. Н.

Пленум аслабаніў тав. ЭЙДЗІНАВА Г. Б. ад абавязкаў 3-га сакратара ЦК КП(б)Б і тав. МАЛІНА В. Н. ад абавязкаў сакратара ЦК КП(б)Б па прапагандзе і агітацыі.

Сакратарам ЦК КП(б)Б па транспарту Пленум выбраў тав. ТУР І. П.

Сакратарам ЦК КП(б)Б па лясной прамысловасці — тав. РЫЖЫКАВА І. І.

Сакратарам ЦК КП(б)Б па прапагандзе і агітацыі — тав. ГАРБУНОВА Т. С., аслабаніўшы яго ад работы адказнага рэдактара газеты «Звязда».

Сакратарам ЦК КП(б)Б па будаўніцтву — тав. ГАНЕНКА І. П.

Сакратарам ЦК КП(б)Б па тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці — тав. РАДЗІЦЕЛЕВА Н. І.

Сакратарам ЦК КП(б)Б па паліўна-энергетычнай прамысловасці — тав. ВЛАСАВА В. Я.

Сакратарам ЦК КП(б)Б па воднаму транспарту — тав. ПРОХАРАВА Н. І., аслабаніўшы яго ад работы загадчыка ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б.

Пленум выбраў трэцім сакратаром ЦК КП(б)Б і членам Бюро ЦК КП(б) Беларусі — тав. ВАНЕЕВА В. Г.

Адказным рэдактарам газеты «Звязда» Пленум зацвердзіў тав. АСТАПЕНКА М. К.

V СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР 1-ГА СКЛІКАННЯ

Інфармацыйныя паведамленні

27 сакавіка ў вялікім зале Дома ўрада адбылося адкрыццё V сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай ССР.

Сесію адкрыла Старшыня Вярхоўнага Совета БССР дэпутат Н. Г. **Грэкава.**

Тав. Грэкава аглашае пералік пытанняў, унесеных на разгляд V сесіі Вярхоўнага Совета БССР.

Дэпутат Ф. П. **Сіляеў** прапануе ўключыць унесеныя на разгляд Вярхоўнага Совета пытанні ў парадак дня V сесіі Вярхоўнага Совета БССР.

Сесія Вярхоўнага Совета аднагалосна зацвярджае наступны парадак дня:

1. Зацвярджэнне Дзяржаўнага бюджэта Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі на 1941 год.

2. Зацвярджэнне указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, прынятых у перыяд паміж сесіямі і падлягаючых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета БССР.

З дакладам па першаму пункту парадку дня V сесіі Вярхоўнага Совета БССР — аб Дзяржаўным бюджэце БССР на 1941 год выступіў намеснік народнага камісара фінансаў БССР тав. **Катляроў** Г. П., з садакладам па гэтаму пытанню выступіў старшыня бюджэтнай камісіі Вярхоўнага Совета БССР дэпутат В. Н. **Малін.**

Затым пачаліся спрэчкі. На вячэрнім пасяджэнні ў спрэчках выступілі дэпутаты Н. П. **Мельнікаў,** П. І. **Ратайка,** І. М. **Курган,** А. В. **Васільеў,** Ф. Г. **Маркаў.**

Пасля выступлення дэпутата Ф. Г. **Маркава** старшынствуючы — Старшыня Вярхоўнага Совета БССР Н. Г. **Грэкава** абвяшчае першае пасяджэнне V сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай ССР закрытым.

* * *

Учора, 28 сакавіка, у вялікім зале пасяджэнняў Дома ўрада адбылося другое пасяджэнне V сесіі Вярхоўнага Совета БССР.

Старшынствуе — намеснік Старшыні Вярхоўнага Совета БССР дэпутат **Д. Н. Маёраў.**

У парадку дня — спрэчкі аб Дзяржаўным бюджэце БССР на 1941 год.

У спрэчках выступілі дэпутаты: **Г. Ф. Ячмэнеў** (Халопеніцкая акруга, Мінская вобласць), **С. І. Царэнка** (Дварэцкая акруга, Баранавіцкая вобласць), **Т. П. Бумажкоў** (Капцэвіцкая акруга, Палеская вобласць), **К. Г. Зайцаў** (Капыльская акруга, Мінская вобласць), **М. К. Петроўская** (Беластоцкая Пролетарская акруга, Беластоцкая вобласць), **З. В. Сурпін** (Лоеўская акруга, Гомельская вобласць), **Я. Н. Каган** (Слонімская сельская акруга, Баранавіцкая вобласць), **І. Ф. Тэрэхаў** (Горацкая сельская акруга, Магілеўская вобласць), Народны Камісар аховы здароўя БССР **М. І. Кавалёнак, А. І. Федасюк** (Антопальская акруга, Брэсцкая вобласць), **С. М. Мелкіх** (Гомельская Кіраўская акруга, Гомельская вобласць), **І. Н. Рабцаў** (Батуцэўская акруга, Віцебская вобласць).

На гэтым другое пасяджэнне закрываецца.

* * *

Вечарам адбылося трэцяе пасяджэнне V сесіі Вярхоўнага Совета БССР.

Старшынствуе — намеснік Старшыні Вярхоўнага Совета БССР **Д. Н. Маёраў.**

У парадку дня — працяг спрэчак па дакладу аб Дзяржаўным бюджэце БССР на 1941 год.

У спрэчках выступілі дэпутаты: **К. С. Чэрноў** (Смалявіцкая Орджанікідзеўская акруга, Мінская вобласць), **К. Н. Длугашэўскі** (Бярозаўская гарадская акруга, Брэсцкая вобласць), **Н. Г. Герасімчык** (Слонімская гарадская акруга, Баранавіцкая вобласць), Народны Камісар комунальнай гаспадаркі БССР **В. С. Забела, П. Г. Шапавалаў** (Матыкальская акруга, Пінская вобласць), **І. Л. Чорны** (Дуброўская акруга, Палеская вобласць), **Н. І. Грыбаедаў** (Саколкаўская акруга, Беластоцкая вобласць), **М. Т. Амельяновіч** (Браслаўская акруга, Вілейская вобласць), **О. А. Сысоева** (Плотніцкая акруга, Пінская вобласць), **Д. С. Маўчанскі** (Бельская сельская акруга, Беластоцкая вобласць), **Ф. Я. Дзянісевіч** (Баранавіцкая Комсамольская акруга, Баранавіцкая вобласць), Старшыня выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных **К. І. Бударын, С. С. Захараў** (Горацкая гарадская акруга, Магілеўская вобласць), **А. М. Дзядзеў** (Брэсцкая сельская акруга, Брэсцкая вобласць).

На гэтым трэцяе пасяджэнне закрываецца.



«Хто смяецца апошнім» К. Крапівы ў Маскоўскім Тэатры сатыры. Фінал І акта. У ролі Гарлахвацкага — засл. артыст РСФСР **Д. Кара-Дзмітрыеў,** у ролі Тулягі — засл. артыст РСФСР **Р. Корф.**

Фота Фабісовіча.

„Хто смяецца апошнім“ на сцэне Тэатра сатыры

10 студзеня 1941 года адкрылася заслона першага прадстаўлення п'есы беларускага драматурга К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» на сцэне Тэатра сатыры ў Маскве. П'еса прайшла 25 разоў і зрабіла 25 аншлагаў. Ужо адно гэта сведчыць аб тым вялікім поспеху, якім карыстаецца п'еса К. Крапівы ў гледачоў. Праўда, сімпатыі маскоўскага гледача гэта п'еса заваявала ўжо раней, у часе дэкады беларускага мастацтва. Глядач з неаслабнай увагай сочыць за перыпетыямі п'есы, хвалюецца разам з яе героямі і горача перажывае іх поспехі і паражэнні.

Маскоўскі Тэатр сатыры заняў у гэтай п'есе сваіх вядучых актораў. Нас прыцягвала ў ёй незвычайна жыццёвая праўдзівасць вобразаў, якія даюць масу магчымасцей для акторскай ігры, ідэйная мэтаімкнёнасць, цікавая, дасціпна задуманая і выкананая драматургічная форма.

Прэса высока ацаніла работу тэатра. Амаль уся цэнтральная і маскоўская прэса адзначыла вялікі поспех спектакля. Цэнтральным вобразам спектакля стаў Туляга ў таленавітым выкананні заслужанага артыста РСФСР Р. Корфа. Вось яго першае паяўленне: маленькі, сівы чалавечак, баязліва азіраючыся, выходзіць на сцэну. Ён ідзе на цыпачках, яго шыю падпірае высокі, тугі крахмальны каўнерык. Зараз на вуліцы нехта прыняў яго за дзянікінскага палкоўніка Падгаецкага і ён баіцца, што не зможа даказаць, што ён не палкоўнік. Гэта вельмі смешная і глыбока кранаючая фігура.

Вось ён, замучаны Гарлахвацкім, робіцца «літаратурным неграм»—піша для Гарлахвацкага вучоную працу «Новы від выкапня». І, нарэшце, фінал: пры дапамозе сакратара парткома Левановіча, супрацоўніцы інстытута Веры і прафесара Чарнавуса, якога Гарлахвацкі спрабаваў ашальмаваць, прайдзісвет Гарлахвацкі выкрыт. Скончылася ганебнае для Гарлахвацкага пасяджэнне вучонага совета. Пайшлі супрацоўнікі. Дворнік Нічыпар выкінуў Цюліку костку, тую самую костку, на падставе якой Гарлахвацкі спрабаваў стварыць вобраз «свінячага моманта».

У кабінеце—панікшы Гарлахвацкі і недзе ў глыбі, схаваўшыся за шкілет яшчара,—Туляга. Гарлахвацкі падымае галаву і заўважае яго. Са сціснутымі кулакамі кідаецца ён на Тулягу. Мы чакаем, што той спалохаецца, задрыжыць, але... Туляга ўжо не той: з гордa ўзнятай галавой, заклаўшы рукі за спіну, ступаючы на поўную ступню, праходзіць ён міма Гарлахвацкага. Заслона закрываецца пад дружныя апладысменты гледачоў. Гэтымі апладысментамі яны вітаюць новага Тулягу, які стаў сапраўдным совецкім чалавекам.

Ролю Чарнавуса выконвае заслужаны артыст РСФСР Я. Волкаў. У яго паказе Чарнавус сапраўдны совецкі вучоны, які, не зважаючы ні на якія цяжкасці, будучы ашальмаваны Гарлахвацкім і Зёлкіным, выступае супроць шарлатанаў, апашляючых і аплёўваючых совецкую навуку. На мінуту ён пахіснуўся, але дапамога, якую яму аказалі, робіць яго яшчэ больш непрымірымым, яшчэ больш актыўным. Глядач апладыруе сакратару парткома Левановічу (яго іграе артыст А. Благанраваў), яго заключнай прамове, дзе ён выкрывае цёмныя махінацыі Гарлахвацкага і яму падобных.

Агідных «выкапняў»—Гарлахвацкага і Зёлкіна—выконваюць заслужаны артыст РСФСР Д. Кара-Дзмітрыеў і артыст А. Казубскі. Як удар грому, прагучаў для іх артыкул «Праўды». Спрабуючы адмежавацца ад сваіх брыдот, яны робяцца яшчэ больш агіднымі і брыдотнымі.

Другарадныя вобразы п'есы таксама знайшлі дастойных выканаўцаў. Стораж Нічыпар (артыст І. Зенін), прыбіральшчыца цёця Каця (артыстка К. Фралова), якія выступаюць у абарону Тулягі і Чарнавуса, і дробныя гады—Зіначка Зёлкіна (артыстка В. Такарская) і жонка Гарлахвацкага (артыстка Н. Халатава)—усё гэта жывыя, поўнакроўныя людзі.

П'еса пастаўлена рэжысёрамі І. Раеўскім і А. Карэвым, мастак спектакля І. Зіноўеў.

Калектыў Тэатра сатыры радасна сустрэў узнагароджанне К. Крапівы Сталінскай прэміяй. І мы чакаем ад яго новай камедыі, камедыі сатырычнай, бічуючай недахопы, і камедыі жыццёсцвярджаючай, вясёлай і дасціпнай.

Ф. ЛІПСКЕРАЎ.

Рэжысёр Маскоўскага Тэатра сатыры.

Абласная мастацкая выстаўка ў Баранавічах

У музеі выяўленчага мастацтва ў Баранавічах адкрылася 1-я выстаўка работ мастакоў вобласці. На выстаўцы экспаніравана 95 работ 12-ці мастакоў. Большасць работ—партрэты і пейзажы.

Несвіжскі мастак Перскі выставіў дваццаць работ. Амаль усе яны надзвычай аднастайныя, невыразныя. Лепшай сярод іх трэба прызнаць невялікі партрэт старога, у якім ёсць мысль і рэальная перадача характару. Другі несвіжскі мастак Сеўрук выставіў пятнаццаць работ: партрэты, карціны, гравюры. Работы Сеўрука—лепшыя на выстаўцы. Яго партрэты «Каменшчык», «Сялянка» выкананы добра, яны перадаюць не толькі натуру, але і ўнутраныя рысы вобраза.

Прыемнае ўражанне ствараюць і работы мастака Бялецкай (Слонім), якая прадстаўлена на выстаўцы двума партрэтамі і чатырма эскізамі пейзажаў. Яе партрэты старога і мужчыны выкананы ў духу фламандскай школы. У пейзажах Бялецкай многа святла, ёсць пачуццё прасторы.

Мастак Уманскі (Дзятлава) даў пяць рысункаў-карыкатур на злабадзённыя міжнародныя тэмы. Вылучаецца палітычна завостраны малюнак «Сяўба і ўраджай».

Гравюры мастака Грушко (Баранавічы) тэхнічна зроблены добра, але тэматыка іх абмежаваная.

Трэба спыніцца на работах мастака Шарэра (Слонім). Шарэр—здольны мастак, але ўсе яго работы—пейзажы і партрэты — нельга залічыць яму ў актыў толькі таму, што яны далёкі ад рэалістычнага ўспрыняцця жыцця.

Заганай творчасці амаль усіх мастакоў, прадстаўленых на выстаўцы, з'яўляецца адсутнасць сучаснай тэматыкі. А гэта гаворыць аб тым, што мастакам Баранавіцкай вобласці трэба больш глыбока вывучаць жыццё нашай краіны, трэба ўзнімаць свой ідэйны ўзровень.

Выстаўка, безумоўна, мае вялікае значэнне ў выяўленні і згрупіраванні мастацкіх сіл вобласці. Пажадана толькі, каб у часе дэманстрыравання выстаўкі была арганізавана сустрэча мастакоў з працоўнымі, дзе мастакі змаглі-б падзяліцца сваімі творчымі планамі, а гледачы —выказаць свае думкі аб экспаніраваных работах.

М. КАРПАЧОЎ.

Баранавічы.

Праграма работы пісьменнікаў

25 сакавіка партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР абмеркавала вынікі XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б). З дакладам выступіў тав. М. Лынькоў. Дакладчык падрабязна расказаў аб работах і рашэннях канферэнцыі, аб тым вялікім значэнні, якое мае ў жыцці партыі і ўсяго совецкага народа XVIII канферэнцыя ВКП(б), намеціўшая велічную праграму далейшага пабеданоснага руху па шляху к комунізму, праграму далейшага ўмацавання гаспадарчай і абароннай магутнасці краіны соцыялізма.

— Рашэнні XVIII канферэнцыі ВКП(б) —адзначае дакладчык,—маюць непасрэднае дачыненне да совецкай літаратуры, яны ставяць перад совецкай літаратурай адказныя творчыя задачы. Беларуская літаратура павінна шырока паказаць індустрыялізацыю нашай рэспублікі: поспехі развіцця соцыялістычнай прамысловасці, рост рабочага класа. Гэта — пярвейшы абавязак пісьменнікаў БССР.

Пісьменнікі павінны глыбока вывучаць жыццё і штодзённа настойліва павышаць свой палітычны і культурны ўзровень. Дакладчык заўважае, што рад здольных пісьменнікаў, з-за адсутнасці вучобы, у апошні час далі ідэйна і мастацка недасканалыя творы.

Вялікай тэмай нашай літаратуры з'яўляецца адлюстраванне народнага гераізму ў ажыццяўленні сталінскага плана пераўтварэння беларускіх балотаў у квітнеючыя палі і сенажаці. Асаблівую актуальнасць маюць тэмы паказу нашай доблеснай Чырвонай Арміі.—патрэбны творы, выхоўваючыя ў чытача баявы дух, волевыя якасці, мабілізацыйную гатоўнасць.

Усе выступленні комуністаў-пісьменнікаў аб'ядноўвала адна думка: неабходна павярнуць увагу ўсіх пісьменнікаў БССР да тэм сучаснасці, да тэм вялікіх дзён сталінскай эпохі, да тэм соцыялістычнай працы, паказу совецкага чалавека, да тэм совецкага патрыятызму.

— Паказаць ва ўсёй велічы рост прамысловасці і рабочага класа, сваім мастацкім словам змагацца за новыя поспехі прамысловасці і транспарту павінны пісьменнікі БССР,—гаворыць тав. М. Клімковіч.—Я лічу, што Сталінскі РК КП(б)Б гор. Мінска павінен дапамагчы пісьменнікам дасканала азнаёміцца з мінскімі прадпрыемствамі. Тав. Клімковіч указвае і на неабходнасць прыцягнення да літаратурнай працы спецыялістаў, бывалых людзей, якія маюць вялікі практычны вопыт. Тав. Клімковіч уносіць прапанову: да 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі стварыць кнігу аб прамысловасці Совецкай Беларусі.

Т. т. Рудзько, Мазо, Гусеў у сваіх выступленнях ускрылі рад недахопаў у рабоце апарата ССП БССР: адсутнасць кантролю за выкананнем планаў Праўлення, творчых секцый, неналаджанасць работы выдавецтва ССП.

Прапанову тав. Клімковіча аб стварэнні кнігі пра прамысловасць—аб буйнейшых фабрыках і заводах рэспублікі, аб лепшых стаханаўцах—падтрымлівае тав. Л. Кацовіч. Работа над гэтай кнігай, гаворыць ён, дапаможа пісьменнікам падыйсці да глыбокага вывучэння жыцця рабочага класа.

З цікавай прамовай выступіў тав. К. Крапіва. Ён гаворыць аб неабходнасці для кожнага пісьменніка мець сваю базу для творчасці, г. зн. быць непарыўна звязаным з жыццём рабочых ці калгаснікаў, дасканала ведаць людзей працы. Пастановы XVIII канферэнцыі ВКП(б), гаворыць ён, натхняюць кожнага пісьменніка на стварэнне новых, патрэбных чытачам, твораў аб нашай сучаснасці.

— Паказ прамысловасці, абароннай магутнасці нашай радзімы—пачэсная і пярвейшая задача пісьменнікаў,—гаворыць тав. М. Модэль. Далей прамоўца крытыкуе рэдакцыю журнала «Полымя рэволюцыі» за тое, што яна не забяспечыла своечасовага выхаду журнала, гаворыць аб неналаджанасці выхаваўчай работы ў яўрэйскай секцыі, рэзка крытыкуе комсамольскую арганізацыю Саюза пісьменнікаў, якая амаль спыніла сваю дзейнасць.

Па дакладу тав. Лынькова сходам прынята разгорнутае рашэнне, вызначаючае задачы комуністаў-пісьменнікаў у выкананні пастаноў XVIII канферэнцыі ВКП(б).

На гэтым-жа сходзе зацверджан план работы партарганізацыі на красавік—чэрвень. У плане—правядзенне раду адкрытых сходаў, на якіх будуць абмеркаваны новыя творы комуністаў-пісьменнікаў. Будуць таксама абмеркаваны пытанні аб рабоце з маладымі і пачынаючымі пісьменнікамі, аб абароннай літаратуры і ваеннай падрыхтоўцы пісьменнікаў і інш.

А. Б.

Аб працоўным і абаронным выхаванні дзяцей

★ В. Вольскі ★

Вядома, якое вялікае значэнне маюць у выхаванні дзяцей творы мастацкай літаратуры. Добра напісаная кніга пашырае кругагляд юнага чытача. Яна ўзбагачае яго думкі, веды і пачуцці уплывае на фарміраванне характару, на светапогляд.

У гэтых адносінах адказнасць пісьменніка, аўтара мастацкіх твораў для дзяцей, надзвычай вялікая. На савецкага пісьменніка ўскладаецца ганаровая задача — дапамагчы выхоўваць у дзяцей высокія якасці будучых грамадзян сваёй краіны, выдатных майстроў соцыялістычнай працы і мужных абаронцаў радзімы.

У Канстытуцыі Савецкага Саюза сказана: «Праца ў СССР з'яўляецца абавязкам і справай гонару кожнага здольнага да працы грамадзяніна па прынцыпу: «хто не працуе, той не есць». Так напісана ў артыкуле 12-м. І яшчэ сказана ў Сталінскай Канстытуцыі, што абавязак кожнага грамадзяніна СССР абараняць сваю соцыялістычную бацькаўшчыну.

Ці можам мы сказаць, што гэтыя два важнейшыя моманты ў выхаванні дзяцей знаходзяць належнае адлюстраванне ў творах нашай літаратуры? Нажаль, не можам. Наадварот, трэба прызнаць, што тэмы працоўнага і абароннага выхавання займалі да гэтага часу недастатковае месца ў нашай літаратуры.

Праўда, у нас ёсць пэўная колькасць добрых літаратурных твораў, тэматыка якіх звязана ў той ці іншай ступені з момантамі працоўнага і абароннага выхавання, але гэтага недастаткова. У Савецкім Саюзе праца ператварылася «ў справу гонару, у справу славы, у справу доблесці і геройства» (Сталін).

Задача нашай літаратуры для дзяцей заключаецца ў тым, каб паказаць гэта ў жывых і яркіх мастацкіх вобразах, на канкрэтным тэматычным матэрыяле, каб захапіць чытача рамантыкай працы, каб выклікаць яго павагу да працавітых людзей, майстроў і гаспадароў сваёй справы, каб юны чытач шанаваў і цаніў рэчы, зробленыя рукою чалавека.

Мы павінны выхоўваць людзей соцыялістычнай працы.

Адным з асноўных герояў нашых кніг для дзяцей павінен быць чалавек, узброены сучаснай тэхнікай, які робіць працу больш прадукцыйнай, які ўзводзіць яе на ступень мастацтва, каб наша моладзь, чытаючы такія кнігі, адчувала радасць творчай працы, каб яна захаплялася працай, як радасцю жыцця.

Ці многа ў нас такіх твораў?

Тэма соцыялістычнай працы ў беларускай літаратуры для дзяцей закранала-ся пераважна ў невялікіх вершаваных формах. Найбольш яркім і выдатным з ліку такіх твораў, прысвечаных соцыялістычнай працы, з'яўляецца верш Янкі Купалы «Сыны» — аб выбары прафесіі, надрукаваны ў зборніку «Для дзяцей». Думка аб тым, што ўсе прафесіі для савецкага юнака аднолькава ганаровыя, што ўсе яны аднолькава патрэбны і карысны для грамадства, увасоблена ў прыгожыя паэтычныя радкі, сваёй рытмікай і вобразамі арганічна звязаныя з народнай творчасцю. Да гэтага-ж цыклу належаць і вядомыя вершы Янкі Купалы «Алеся» і «Я — калгасніца маладая», таксама змешчаныя ў зборніку «Для дзяцей».

У празаічных творах літаратуры для дзяцей рамантыка працы, героіка працы, паэзія працы не знаходзіла сабе належнага адлюстравання. Рамантычныя, узнёслыя адносіны да працы мы знаходзім толькі ў аповесці Зм. Бядулі «У дрымучых лясах». На старонках гэтай аповесці праца паказана аўтарам як творчае натхненне. У асобе такіх людзей працы, як дзед-меднік, бондар Даніла, сталяр Янка, «які ўсё ўмее рабіць: і вокны, і шафы, і ўслончыкі, і малатарні», мы бачым сапраўды паэтычныя адносіны да сваёй прафесіі, да свайго рамясла. Гэтыя людзі з народа не голькі любяць сваю справу, яны захоплены ёю. Яны працуюць у стане найвялікшага творчага ўздыму, працуюць не для таго, каб зарабіць, а для самой працы. Любімая праца з'яўляецца асноўным сэнсам іх жыцця. Раздзел «Майстры» гучыць у аповесці Зм. Бядулі як сапраўдны гімн чалавечай працы.

Але гэта — праца дарэволюцыйнага саматужніка, праца рамесленіка ў сваёй хатняй майстэрні. Твораў з такім яркім, жывым, рамантычна-прыўзнятым апісаннем сучаснай працы, працы на соцыялістычным прадпрыемстве, мы ў дзіцячай літаратуры БССР пакуль што не маем.

Нядаўна пісьменнік М. Паслядовіч напісаў аповесць «Магістральны канал», галоўнымі героямі якой з'яўляюцца савецкія дзеці. Гэты твор напісан на матэрыяле нашай рэчаіснасці. Тэма яго звязана з работамі па асушцы балот. У аповесці не мала станоўчых момантаў. Асабліва ўдаліся аўтару вобразы дзяцей — Мечыка і яго сяброў. Але, нажаль, у творы М. Паслядовіча мала паказан працэс самой работы па асушцы балот. На працягу ўсёй аповесці дзея разгортваецца пераважна вакол канала, а не на ім. Тэма асушкі балот толькі закранута аўтарам, але не вырашана цалкам. Яна не займае ў творы належнага месца.

З'яўленне «Магістральнага канала», які хутка выйдзе з друку, здаецца нам вельмі своечасовым. Іменна цяпер, пасля апублікавання гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб ператварэнні беларускіх балот у квітнеючыя калгасныя палі і сенажаці, такія творы набываюць для чытача асаблівую цікавасць і актуальнасць. Працуючы над такімі тэмамі, неабходна больш увагі звяртаць на мастацкае ўвасабленне ў творах самога працэсу працы.

З напісанага раней мы мелі толькі адзін буйны празаічны твор, прысвечаны непасрэдна выхаванню працоўных навыкаў у юнага чытача. Гэта — досыць вядомая кніга «ТВТ» Янкі Маўра, якую варта ўспомніць. Задача гэтай патрэбнай і карыснай кніжкі заключалася ў тым, каб выклікаць у чытача імкненне да працоўнай дзейнасці, абудзіць у ім ініцыятыву і наглядальнасць. «ТВТ» паказвала чытачу, колькі карыснага можа зрабіць ён у навакольным жыцці, хаця-б нават у хатняй абстаноўцы.

Дзецям трэба прывіваць працоўныя навыкі з дробязей. Дзяўчынкі могуць дапамагаць маці ў хатняй працы, хлопцам не пашкодзіць часам дроў насячы, званок каля дзвярэй паправіць, крэслы пачыніць. Працавіты чалавек работы не шукае, яна заўсёды знойдзецца. Усяму гэтаму і вучыць «ТВТ». Кніжка Янкі Маўра тым і карысна, што яна падштурхоўвае на ўсё гэта чытача, заахвочвае яго да працоўнай самадзейнасці. І трэба сказаць, што сярод юнага чытача гэта кніжка карысталася поспехам. На працягу досыць доўгага часу яна заставалася адзінай у сваім родзе. Твораў з аналагічнай накіраванасцю ў нас дагэтуль не было.

Пералічанымі творамі, бадай, і вычэрпваецца ўсё тое, што мы маем з працоўнай тэматыкі ў дзіцячай літаратуры БССР.

Значна больш прадстаўлена ў ёй тэматыка абароннага характару. У галіне абароннай паэзіі мы маем цудоўныя вершы Я. Купалы: «Хлопчык і лётчык», «Выпраўляла маці сына», «Наш палкаводзец» і рад іншых. Усе яны надрукаваны ў зборніку «Для дзяцей». З прычыны сваёй прастаты, яснасці думкі і канкрэтнасці зместу яны вельмі блізкі і зразумелы нашым дзецям. Гэта бліскучыя ўзоры песеннай лірыкі, якая так добра ўспрымаецца дзецьмі. У беларускую дзіцячую літаратуру гэтыя творы Я. Купалы, як і творы Якуба Коласа, прыносяць высокую культуру верша, майстэрскую дасканаласць формы, багацце паэтычных вобразаў.

У галіне прозы на абаронныя тэмы напісаны аповесці Міхася Лынькова «Міколка-паравоз» і «Пра смелага ваяку Мішку» і рад асобных апавяданняў Я. Маўра, А. Якімовіча, А. Стаховіча, В. Глазырына, П. Левановіча і інш.

Нажаль, далёка не ўсё з напісанага на гэтыя тэмы заслугоўвае станоўчай ацэнкі. Сярод твораў з абароннай тэматыкай ёсць пэўная колькасць рэчаў слабых, шэрых, напісаных па шаблону. Асаблівай слабасцю вызначаюцца творы з пагранічнага жыцця. Справа ў тым, што за апошнія два-тры годы ў нашай літаратуры для дзяцей прайшла цэлая паводка дробных апавяданняў і нават п'есак пра шпіёнаў. Усе гэтыя апавяданні надзвычай падобны адно на другое. У іх апісваецца, звычайна ў гіпербалізіраваных памерах, без пачуцця меры і такту, як дзеці ловяць шпіёнаў. Амаль ва ўсіх апавяданнях на гэтыя тэмы безраздзельна пануюць нежыццёвыя схемы і штамп. Такія творы карысці не прыносяць. Яны могуць развіць у юнага чытача павярхоўнасць і саманадзейнасць, лёгкадумныя адносіны да рэчаіснасці.

З ліку буйных празаічных твораў на абаронныя тэмы вылучаюцца аповесці М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку» і «Міколка-паравоз». Абодва гэтыя творы напісаны для дзяцей і пра вайну. Першы з іх прысвечан падзеям вайны з панскай Польшчай у 1920 годзе. У напоўказачнай, напоўрэалістычнай форме апавядае М. Лынькоў пра смешныя прыгоды маладога мядзведзя Мішкі на фронце, пра яго смелыя ўчынкі, пра яго слаўных сяброў — казла Барадатага і сабаку Жука. Незвычайныя прыгоды гэтых трох звяроў разгортваюцца на фоне зусім рэальнага баявога жыцця чырвонаармейцаў. Забаўны сюжэт выкарыстоўваецца аўтарам для таго, каб даць чытачу належнае ўяўленне аб Чырвонай Арміі і яе байцах. Вясёлая, жартаўлівая кніжка гэта прасякнута савецкім патрыятызмам. Напісана яна цёпла, з усмешкай, з глыбокім пачуццём прыроды.

Другі твор М. Лынькова, «Міколка-паравоз», з'яўляецца аповесцю з часоў рэволюцыі і грамадзянскай вайны. У цэнтры падзей аповесці — вобраз сына машыніста, хлопчыка Міколкі, і яго старога дзеда, былога «героя турэцкай вайны і імператарскіх ордэнаў кавалера».

У гэтай кнізе ўстаюць перад чытачом вобразы народнай вайны супроць чужаземных інтэрвентаў. Абодва сябры, і дзед і ўнук, ідуць у партызаны. Вайна паказана аўтарам такой, якой яна была ў сапраўднасці, без упрыгожвання, але адначасова з гэтым аповесць яго поўна жыццёвай радасці і аптымізму.

На гэтыя моманты, удала вырашаныя М. Лыньковым, трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Вайна — гэта не парад. Перад юным чытачом не варта яе ўпрыгожваць. На вайне перамагае той, хто ўмее самаадданна і прадукцыйна працаваць на сваім участку, хто ўмее мужна, самаадданна і смела змагацца з ворагамі на фронце.

Тут паўстае пытанне аб смеласці. Ёсць народныя прымаўкі: «Смеласць гарады бярэ», «Смеламу бог памагае».

Што такое смеласць?

«У кожнай небяспецы, — пісаў Талстой, — ёсць выбар. Выбар, зроблены пад уплывам благароднага ці нізкага пачуцця, ці-ж не ёсць тое, што трэба называць храбрасцю ці баязлівасцю».

Зрабіць правільны выбар і трымаць сябе як належыць у цяжкія, небяспечныя хвіліны дапамагае чалавеку самадысцыпліна. Смеласць і геройства на фронце немагчыма без самадысцыпліны, як немагчыма без самадысцыпліны і прадукцыйная праца. Самадысцыпліна аднолькава патрэбна як у малых, так і ў вялікіх справах.

Сярод твораў, якія закранаюць непасрэдна пытанні дысцыпліны і паводзін вучняў у школе, дома і на вуліцы, мы можам назваць аднаактавую п'есу А. Якімовіча «Чалавек-невідзімка» і аповесць «Насцечка» Кузьмы Чорнага.

Добра напісаная кніга для дзяцей мае звычайна тую ўласцівасць, што яе ахвотна чытаюць і дарослыя. Гэта можна сказаць і аб «Насцечцы» Кузьма Чорнага. Аповесць напісана для дзяцей, але дзякуючы свайму праўдзіваму сюжэту і яркім жыццёвым вобразам яна цікава не толькі для юнага чытача, але і для дарослых.

Самадысцыпліну неабходна выхоўваць і развіваць з маленства. У мастацкіх творах дзіцячай літаратуры гэта павінна знайсці сваё адлюстраванне.

Пісьменнікам, якія пішуць для дзяцей, трэба адзначаныя намі вышэй моманты добра ўлічыць у сваёй творчай рабоце. Адсюль, між іншым, зусім не вынікае, быццам тэматыка будучых твораў дзіцячай літаратуры павінна быць абмежавана пэўнымі рамкамі. Няма тэм абавязковых, як няма і тэм забароненых. Пісаць можна на любую тэму. Важна толькі, каб моманты, аб якіх мы тут гаварылі, знаходзілі сабе належнае вырашэнне ў літаратурных творах. Для гэтага можна карыстацца самым рознастайным матэрыялам.

Узяць, напрыклад, біяграфічную аповесць ці раман. У нас, на Беларусі, гэты жанр амаль зусім не развіт. Між тым, патрэбнасць у ім вялікая. Ці можна, карыстаючыся гэтым жанрам, выконваць задачы працоўнага выхавання моладзі? Бясспрэчна, можна. Для гэтага неабходна спыніць увагу чытача на тых цяжкасцях і перашкодах, якія перамагаў на сваім шляху той вялікі чалавек, аб жыцці якога пішацца твор. Трэба паказаць яго працавітасць і настойлівасць, яго волю да перамогі, яго ўменне дамагацца пастаўленай мэты.

У біяграфічных творах наглядаецца часам няправільны падыход да паказу героя. Часта вялікі чалавек паказваецца вялікім і незвычайным ледзь не з самай калыскі. Паказваюцца часам толькі тыя бліскучыя вынікі, якія з'явіліся дзякуючы цяжкім, упартым і паслядоўным намаганням героя, а не самы працэс іх дасягнення. Між тым, неабходна, каб чытач зразумеў, што геройства, слава, прызнанне заслуг — гэта толькі завяршэнне цяжкага шляху, поўнага нястомнай працы і ўпартых шуканняў.

Перад юным чытачом павінен устаць са старонак біяграфічнага твора вобраз чалавека творчага, чалавека настойлівай працы, чалавека з чоткім і выразна акрэсленым характарам — станоўчы ўзор для пераймання. Жыццё выдатных людзей, увасобленае ў мастацкіх вобразах, заўсёды можа быць удзячным матэрыялам для выхавання моладзі.

Нельга абмінаць і жанр краязнаўчай літаратуры, які ў нас зусім адсутнічае. Значэнне краязнаўчай літаратуры досыць вялікае. Яна ўзбагачае навуковыя веды юнага чытача і гэтым дапамагае школьнаму выкладанню, яна развівае ў ім наглядальнасць да з'яў прыроды, любоў да роднай краіны, уменне арыентыравацца ў ненаселенай мясцовасці. Краязнаўчая літаратура развівае ў чытача імкненне да падарожжаў, да турызму, да жыцця ва ўмовах прыроды, яна спрыяе развіццю тых якасцей, якія вельмі неабходны для будучага байца, абаронцы радзімы.

У справе выхавання якасцей, неабходных для будучага абаронцы радзімы, краязнаўчая літаратура, літаратура аб родным краі і далёкіх краінах, аб падарожжах, навуковых экспедыцыях і вынаходках, можа быць вельмі карыснай.

Калі ўсе іншыя жанры выхоўваюць пераважна светапогляд і пачуцці юнага чытача, дык краязнаўчая літаратура найбольш спрыяе фарміраванню характару. Што можа быць прывабней, рамантычней для юнака, як вандроўкі па роднай краіне, як ночы ў лесе ля кастра, як падарожжа па невядомай мясцовасці? Няма ў свеце такога хлопчыка, які-б у думках не жыў разам з Папаніным на ільдзіне, які-б не марыў аб мужным, суровым жыцці ў лесе, аб паляванні на дзікіх звяроў, аб удзеле ў навуковых і ваенных экспедыцыях. Такія краязнаўча-прыгодніцкія творы, як «Палескія рабінзоны» Я. Маўра, у значнай ступені задавальняюць гэтыя патрабаванні юнацтва. Краязнаўчая літаратура дае юнаму чытачу вялікую эмацыянальную зарадку, яна спрыяе развіццю тых навыкаў, якія патрэбны будучаму байцу.

«Краязнаўства — справа, значэнне якой не можа быць перапавялічана», — пісаў М. Горкі. Між тым, краязнаўчая літаратура ў нас, на Беларусі, зусім не існуе. Нам неабходна развіваць гэты жанр.

Мы бачым, што задачы працоўнага і абароннага выхавання моладзі нічым не абмяжоўваюць творчых магчымасцей пісьменніка. Наадварот, тэмы і жанры для вырашэння гэтых задач могуць быць вельмі шырокія і рознастайныя. Трэба толькі помніць аб тым, каб усе творы дзіцячай літаратуры, акрамя свайго пазнавальнага значэння, былі накіраваны на тое, каб выхоўваць у нашага юнацтва, у нашых дзяцей любоў да працы, самадысцыпліну, мужнасць, сілу волі, фізічную загартаванасць, каб развіваць у юнага чытача тыя ўласцівасці і навыкі, якія неабходны для кожнага маладога грамадзяніна савецкай краіны, — чалавека соцыялістычнай працы і мужнага абаронцы радзімы, пе[…] мужнага ўдзельніка будучых вялікіх баёў за комунізм.



«Без віны вінаватыя» Астроўскага ў Пінскім абласным беларускім драмтэатры. У ролі Мурава арт. В. Гарачун, у ролі Кручынінай арт. Е. Абрашкевіч.

Фота В. Былева (БЕЛТА).





НА ВЫСТАЎЦЫ «ЛЕНІН І СТАЛІН — АРГАНІЗАТАРЫ БССР».



1) «Гранатамётчык», скульптура І. Эйдзльмана, 2) «Сустрэча танкістаў з вызваленым народам Заходняй Беларусі», барэльеф засл. дзеяча мастацтваў БССР А. Бембеля, 3) «Партызан», скульптура В. Бохана.

Фота І. Капліпскага.

Новыя творы беларускіх кампазітараў

★ В. Ефімаў ★

З году ў год узбагачаецца музычнае мастацтва Совецкай Беларусі. Аб гэтым яскрава сведчаць новыя оперы, сімфоніі, сімфанічныя паэмы, фантазіі, інструментальныя і вакальныя творы самых розных форм і жанраў, створаныя кампазітарамі БССР.

Следам за дэкадай беларускага мастацтва, у лістападзе 1940 года ў Маскве былі арганізаваны два вечары беларускай совецкай музыкі: вечар народнай артысткі СССР зараз лаурэата Сталінскай прэміі Л. П. Александроўскай і сімфанічны канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў.

У 1940 годзе кампазітарамі БССР напісаны чатыры новых оперы: А. Туранковым—«Пагранічнікі» (лібрэта І. Шапавалава), Н. Шчагловым — «Кацярына» (лібрэта М. Клімковіча), В. Залатаровым—«Ак-Гюль» (узбекская), П. Падкавыравым — «Як гартавалася сталь» (лібрэта М. Юдэлевіча па аднайменнаму раману Н. Астроўскага). Кампазітар Е. Цікоцкі напісаў радыё-араторыю. Новыя сімфанічныя творы напісаны Н. Аладавым, І. Столавым, В. Залатаровым, Г. Пукстам, новыя канцэрты—М. Крошнерам, А. Клумавым, І Столавым. Кампазітар Н. Чуркін стварыў паводле народных матываў музкамедыю «Кок-сагыз», а С. Палонскі і М. Іваноў — музкамедыю «Зарэчны барок».

Беларускімі кампазітарамі музыкальна аформлен рад спектакляў: «Цвей кунілемлэх»—М. Крошнерам, «Няроўны шлюб», «Дура для іншых, разумная для сябе» і «Фландрыя» — Е. Цікоцкім, «Пагібель воўка» — І. Любанам, «Праздзелкі Скапена» — С. Палонскім. Кампазітар А. Туранкоў напісаў музыку к фільму «Жніво», С. Палонскі—к фільму «Песня пра дружбу». Оперу для дзяцей «Казка пра рыбака і рыбку» напісаў Рабунскі. П Падкавыраў аформіў дзве дзіцячыя радыё-п'есы.

Кампазітарамі БССР напісана значная колькасць камерных твораў (інструментальных і вакальных), апрацовак народных песень, масавых песень, твораў эстрадных форм, хораў і твораў для аркестра народных інструментаў (Чуркін, Ефімаў, Іваноў, Любан, Лукас, Алоўнікаў, Равенскі, Сакалоўскі, Самохін і інш.).

Беларускія кампазітары дзейсна рыхтуюцца і да лермантаўскіх дзён. Т.т. Багатыроў, Туранкоў, Крошнер і Рабунскі напісалі ўжо рад музыкальных твораў на тэксты вялікага рускага паэта.

Асаблівай увагі, як творы, якія пашыраюць творчы дыяпазон беларускіх совецкіх кампазітараў, заслугоўваюць опера Падкавырава, канцэрт для скрыпкі Столава, араторыя на тэкст Я. Купалы «На заходнебеларускія матывы» Цікоцкага і скрыпічная саната Крошнера.

Урыўкі з оперы «Як гартавалася сталь» выконваліся па радыё, у Доме Чырвонай Арміі і на творчым вечары аўтара. Асабліва моцнае ўражанне на слухача сваёй музыкальнай арыгінальнасцю і дасканаласцю ўтвараюць «Расказ Панкратава», арыя Кліма, «Песня пра Параску» і інш. Меладычная і гарманічная мова аўтара оперы свежая і цікавая.

«Канцэрт для скрыпкі» Столава — цікавы, значны па сваіх мастацкіх якасцях музычны твор. Асабліва захапляе слухача віртуозная тэхніка аркестроўкі Столава. Своеасаблівыя маляўнічыя гармоніі, рознастайная і вострая рытміка ўласцівы яго твору. «Канцэрт для скрыпкі», выканаиы аўтарам у Маскве, атрымаў адабрэнне кампазітараў і музыказнаўцаў сталіцы.

Скрыпічная саната Крошнера з'яўляецца новым творчым поспехам гэтага здольнага кампазітара. Свежасць тэм, іх паслядоўнае развіццё, а таксама лёгкае ўспрыняцце слухачом музыкальнага матэрыялу — *асноўныя* вартасці твора. Саната ўдала заканчваецца нечаканым «адажыо». Варта адзначыць і вялікае развіццё фортэп'яннага суправаджэння.

У сучасны момант кампазітары Совецкай Беларусі дзейсна рыхтуюцца да 25-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Н. Аладаў працуе над балетам «Змей Кашч» Е Цікоцкі—над 2-й сімфоніяй, А. Клумаў—над фортэп'яннай санатай fis-moll у 3-х частках, І. Любан—над музыкай да «Кургана» Я. Купалы, Д. Лукас—над афармленнем дзіцячай радыё-п'есы. В. Алоўнікаў піша хоры на тэксты Лермантава, А. Папоў — аднаактную дзіцячую оперу «Церамок», С. Палонскі — паэму для віяланчэлі з акампанементам.

Кампазітары і музыказнаўцы БССР разгарнулі работу па творчай падрыхтоўцы да 25-годдзя Вялікага Кастрычніка. Нядаўна Саюз совецкіх кампазітараў БССР зацвердзіў заяўкі на музыкальныя творы і навуковыя работы, прысвечаныя вялікаму 25-годдзю. Сярод іх «Уверцюра к 25-годдзю Кастрычніка» Н. Аладава, сімфанічная паэма к 25-годдзю Совецкай улады А. Багатырова, урачысты марш для духавога аркестра М. Іванова, сюіта для сімфанічнага аркестра М. Крошнера, музыкальная інсцэніроўка «Калгасная вечарынка» І. Любана, кантата к 25-годдзю Кастрычніка А. Папова, сімфанічная паэма к 25-годдзю Кастрычніка П. Падкавырава, сюіта для хора С. Палонскага, сімфонія, прысвечаная Кастрычніку, І. Столава, канцэрт для віяланчэлі з аркестрам А. Туранкова, струнны квартэт Н. Чуркіна, сімфанічная паэма з хорам Н. Шчаглова, струнны квартэт Е. Цікоцкага, 2-я сімфонія Г. Самохіна і музыказнаўчыя творы: «Беларуская музыка за 25 год» А. Карповіча, «Апрацоўка беларускіх народных песень» М. Зінчука, «Вопыт даследвання беларускай народнай песні» В Ефімава.

Стварэнне высокамастацкіх музычных твораў, прысвечаных 25-годдзю Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, — адказная і ганаровая задача кожнага совецкага кампазітара. Яна становіцца яшчэ больш значнай у сувязі з тым, што адзін з членаў Саюза кампазітараў *ордэнаносец* А. В. Багатыроў удастоены высокай узнагароды — Сталінскай прэміі 2-й ступені за оперу «У пушчах Палесся». Выключныя клопаты партыі і совецкага ўрада аб рознастайных галінах працы таленавітых прадстаўнікоў народа, у прыватнасці аб музыкальнай культуры Совецкай Беларусі, акрыляюць кампазітараў на стварэнне манументальных класічных совецкіх музычных твораў, вартых нашай сталінскай эпохі.

Народная песня ў творчасці Мусаргскага

Да 60-годдзя з дня смерці кампазітара

★ С. Нісневіч ★

«Мастацтва ёсць сродак для гутаркі з людзьмі, а не мэта»,—гэтым выказваннем М. П. Мусаргскага як нельга лепш вызначаецца яго творчая дзейнасць, дзейнасць буйнейшага рускага кампазітара-рэаліста.

Дзіцячыя ўражанні, непарыўна звязаныя з вобразам няньці, прывіўшай яму цікаўнасць да народнай творчасці, і затым моцны ўплыў рэволюцыйнага народніцкага руху 60-х год (асабліва Чэрнышэўскага) на ўсё жыццё замацавалі павышаную цікавасць Мусаргскага да ўсяго, што датычыць народа ў цэлым і сялянства ў прыватнасці. Любоў да народа, сапраўдная гуманнасць вялікага мастака дапамаглі яму зразумець і ўсвядоміць шматграннае і шматпакутнае жыццё народа ва ўсёй яго непрыглядпай аголенасці, дапамаглі бачыць мільёны рускіх сялян, гінучых ад голаду і гнёту. Так ствараласяя ім непаўторная па майстэрству псіхалагічнага раскрыцця вобразаў галерэя абяздоленых і няшчасных людзей: «Сіротка», «Калістрат», «Спі, засні, сялянскі сын» і г. д.

Але сіла і майстэрства Мусаргскага не толькі ў партрэтных характарыстыках няшчасных, прыдушаных горам. Паказ «сілы маладзецкай», удальства народнага, затоенай сілы багатырскай—у гэтым найвялікшае яго майстэрства.

М. П. Мусаргскі стварае манументальныя і грандыёзныя па маштабу народныя музыкальныя драмы—«Барыс Гадуноў» і «Хаваншчыну», дзе галоўнымі дзеючымі асобамі з'яўляецца народ.

Думаючы аб народзе і ствараючы яго вобраз у сваіх творах, Мусаргскі перш за ўсё стараецца вывучыць і творча пераўтварыць яго музыкальную мову, як сродак сувязі з ім, як сродак раскрыцця яго ўнутранага свету. Мусаргскі не абмяжоўваецца вывучэннем рускай народнай песні,—ён не прапускае ні аднаго зручнага выпадку, каб не паслухаць і не выкарыстаць пачутыя мелодыі. Вядома, што з Каўказа ён прывёз духоўныя стараверчаскія запісы, якія з поспехам выкарыстаў у «Хаваншчыне»; украінскія народныя песні ён паклаў у аснову «Сарачынскага кірмашу»; зрабіў ён шмат запісаў кіргізскіх і ўсходніх народных песень. Неабходна адзначыць, што Мусаргскага цікавілі не толькі напевы народных песень,—вялікую цікавасць праяўляў ён і да іх тэкстаў, неаднаразова забяспечваючы імі Рымскага-Корсакава (напрыклад, хор у «Пскавіцянцы») і выкарыстоўваючы ў сваіх операх.

Народная песня ў цэлым з'яўляецца адной з жывіцельных крыніц, харчуючых оперную творчасць Мусаргскага, але выкарыстанне яе Мусаргскім нясе на сабе адбітак своеасаблівага творчага пераўтварэння. Рэдка калі песня даецца ім у выглядзе цытатнага матэрыялу з захаваннем арыгінальнасці мелодыі і тэксту. Такія прыклады часцей за ўсё сустракаюцца ў «Сарачынскім кірмашы», багатым жанравымі карцінкамі і ўстаўнымі нумарамі, дзе не ставіцца за мэту даць шырокае драматычнае развіццё дзеяння, альбо ўстаўныя хоры дзяўчат у оперы «Хаваншчына», якія таксама маюць на мэце жанравасць. Асобна стаіць цытатны прыклад з «Хаваншчыны»—песня Марфы «Выхадзіла маладзёшанька», якая была потым унесена Рымскім-Корсакавым у зборнік народных песень з яго гарманізацыяй. Тут, пры дапамозе рэгістравых змен і вар'іраванага суправаджэння, песня атрымлівае шырокае развіццё і змену настрою і з'яўляецца ўзорам мастацкай апрацоўкі народнай песні.

Звычайна ў сваіх операх Мусаргскі выкарыстоўвае фальклор наступным чынам: на сапраўды народны тэкст піша музыку, як гэта мае месца ў хоры «Расхадзілася, разгулялася сіла маладзецкая» («Барыс Гадуноў»), альбо, наадварот, выкарыстоўвае мелодыі народных песень для музыкальнага афармлення тэксту лібрэта. Гэты апошні прыём знайшоў даволі шырокае прымяненне ў оперы «Сарачынскі кірмаш», дзе на гэтым прынцыпе пабудаван рад дыялагаў, напрыклад, дыялаг Чаравіка і Грыцко. Чаравік спявае: «Ці-ж можна з маёй дачкой...», а Грыцко яму адказвае: «Ба, ды гэта сам Салопій»,—абодва на матыў украінскай народнай песні «Як пішов я до дивчини».

Але найбольшае сваё прымяненне знайшоў наступны прынцып выкарыстання народнай песні: яна не даецца ў выглядзе цытатнага матэрыялу, ад яе бяруцца толькі некаторыя характэрныя інтанацыі, прычым часам змяняюцца працягласці. У гэтых адносінах характэрна сярэдняя частка буйнага, магутнага хора «Расхадзілася, разгулялася сіла маладзецкая» («Барыс Гадуноў»), пачынаючы ад слоў «Ой ты, сіла, сілушка», дзе ўзяты характэрныя інтанацыі рускай народнай песні «Зайграй, мая валынка» (песня, якая ёсць у зборніку Балакірэва). Шляхам своеасаблівага акцэнціравання яна набывае затоеную сілу і вялікі размах. Цікава таксама выкарыстан першы такт рускай народнай песні «Стой, мой мілы карагод» для стварэння пераможнага гімна раскольнікаў «Пабядзіхом, пасрамíхом» («Хаваншчына»).

Але не толькі ў хорах выкарыстоўваецца Мусаргскім гэты прыём, — у сварцы Хіўры з Чаравікам («Сарачынскі кірмаш») інтанацыі, якія прыходзяцца на фразы «Гэта што такое, да чаго ты ўздумаў» і г. д., заснаваны на інтанацыях украінскай народнай песні. Тое-ж і з другой песняй Варлаама з сцэны ў карчме («Барыс Гадуноў») — «Едзе ён», заснаванай на інтанацыі рускай народнай песні.

Не маючы магчымасці, з-за абмежаванасці месца, прывесці ўсе прыклады, якімі багаты оперы Мусаргскага, — прыклады такога своеасаблівага пераўтварэння народнай песні, — хочацца толькі адзначыць, што не заўсёды кампазітар бярэ інтанацыі з пэўных народных песень як у хорах, так і ў сольных нумарах. Значна часцей ён карыстаецца зваротамі, характэрнымі для народных песень наогул, маючы на ўвазе не толькі інтанацыйныя яе асаблівасці, але і метрарытмічныя і ладавыя. Прыгадаем прычыты народа ў сцэне ля сабора Васіля Блажэннага («Барыс Гадуноў»), прычыты Ксеніі (там-жа), трэньканне на балалайцы Кузькі («Хаваншчына») і рад іншых прыкладаў, дзе гэтыя элементы стварылі карціну сапраўды рускага народнага каларыту.

Само выкарыстанне народнай песні і яе элементаў ніколі не знізжалася ў Мусаргскага да голага прымітыву,—празмерна багатая вар'іраванасць, заснаваная на багатай фантазіі вялікага мастака (прыём вар'іравання выцякае са структуры і асаблівасцей куплетнай формы народнай песні), і шырокае развіццё, веданне, асваенне і своеасаблівае прымяненне лепшых прыёмаў гармоніі рамантыкаў — усё гэта ўзнімала народную песню ў творчасці Мусаргскага да найвялікшых вышынь музычнага мастацтва і дапамагло яму стварыць свой індывідуальны каларытны стыль —цэлую эпоху ў развіцці рускай музычнай творчасці.

Эфроім Каганоўскі

Губернатар

★ **Навела** ★

Ужо цямнелася, калі сям'я ўзабралася на самы верх дома і заняла падстрэшны пакой, што пад самым дахам.

На гару ўсцягнулі два драўляных ложкі і старую жалезную скрыню, за якой праследваў чалавек год пяцідзесяці пяці, тоўсты, з чырвоным, каротка абстрыжаным каркам. На ім былі сінія вайсковыя нагавіцы і цяжкі картуз, і меў ён выгляд старога ваякі з царскай арміі. За ім ішлі жонка, самавітая, важная дама з сівізною пад вэлюмам, і дачка. Пры ўбачанні іх яўрэйскія жыхары дома вырашылі, што гэта былі вельмі знатныя калісьці персоны. Хутка стала вядома, што новы кватарант быў быццам-бы губернатарам у горадзе К***. Цікавасць да падстрэшнага пакоя непамерна расла.

Гандляр Рабіновіч, які займаў кватэру на нізу, пры спатканні з новым кватарантам, на ўсякі выпадак, скідаў шапку. Усе іншыя жыхары дома, якія належалі да заможных, былі цяпер не пры справе і цешыліся аднымі толькі цяжкімі адмычкамі ад апячатаных цяпер крам, ды жылі на зберажэнні, за кошт рэштак мінулага. Дзень і ноч чакалі яны «вызваліцеляў» з сушы і з мора.

У гарачыя одэскія летнія вечары, калі вялікія зоры нізка звісалі з небасхілу, на акуратным «буржуйскім» дворыку гуло, як у вуллі. Часам хто-ні-хто з абітальнікаў двара набліжаўся да варот і глядзеў праз шчыліну клямкі на апусцелую вуліцу, адкуль раз-па-разу далятала траскатня выстралаў і свіст шальных куль.

Жахам веяла з надыходам вечара ад вымерших, але асветленых і прасторных вуліц. Здавалася, нячыстая сіла зачаравала горад і ледзь чутны шорах рэдкіх хапатлівых крокаў праходзіўшых паўз вароты, наводзіў ужо на думку пра забойства і гвалт.

Абываталі сядзелі па сваіх дворыках і шэптам перамаўляліся. Усё, пра што тут гаварылі, мела вычварны сэнс. Гаварылі аб тым, хто-б гэта адважыўся выйсці зараз на вуліцу. Расказвалі пра буйных багацеяў, якія «скочылі» у мора і паплылі ў Францыю. Шапталіся аб тым, што бальшавікі мяркуюць забраць усіх жанчын. Перадавалі ўсемагчымыя фантастычныя распараджэнні. Пры найменшым сапраўдным ці ўяўным шораху за зачыненымі варотамі разбягаліся ў дзікай паніцы па кватэрах, грукаючы дзвярыма і ляскаючы заваламі.

Да ўсіх фантастычных і страшных апавяданняў прыбавілася яшчэ гісторыя з «губернатарам», які жыў на падстрэшшы.

Жыхары невялікага мяшчанскага дворыка раптам адчулі, што ў гэтым пакоі, які знаходзіцца пад самым дахам дома, тоіцца штосьці хвалюючае. Розныя гісторыі, адна за другую больш дзіўныя, пачалі сплятацца вакол новага жыхара—«губернатара». Рабіновіч, які ўпэўніваў усіх, што ведае губернатара ўжо вельмі даўно, расказваў, што губернатар паходзіць з царскай сям'і, што ён меў каханку, славутую актрысу, з-за якой нават страляўся. Вымершыя, пустыя вуліцы, якія ператварыліся цяпер у арэну стаіўшыхся жахаў, распалялі фантазію бяздзейсных абываталяў, і найменшы рух на губернатарскай мансардзе падхапліваўся з ліхарадкавай цікавасцю.

Але вось настала дзіўныя дні. Вуліцы ўзбурліліся і закалыхаліся ад зацятай, разрываючай паветра стралянiны.

У светлыя летнія дні вароты былі зачынены, як граніца паміж жыццём і скаланаючай жудасцю смерці. Па цэлых днях абываталі двароў з бледнымі і напалоханымі ўсмешкамі асуджаных прастайвалі пад сценамі дамоў з нямым пытаннем у позірку: «Куды схавацца?» Яшчэ больш няміласэрнымі і страшнымі былі ночы, калі разам з цемраю вайна быццам наравіла з вуліцы прабрацца ў анямелыя ад жаху двары.

У адзін з такіх вечароў, калі здавалася, што ўжо ніколі нельга будзе ступіць за вароты дома, калі выбухі гармат з пякельным грукатам рассыпаліся па дахах, на двары раптам з'явілася плячыстая, моцная фігура загадкавага кватаранта. Ён быў без картуза, у чырвонай шырокай рускай кашулі і ўтвараў такое ўражанне, быццам штосьці выгнала яго з дому. Перапалоханыя абываталі ўмомант адчулі, што іх крэпасць рушыцца. Яны моўчкі акружылі «губернатара» з роспачнымі запытаннямі ў позірках: «Што-ж гэта робіцца?» і «Што-ж гэта будзе?» Жыхар Рабіновіч не вытрымаў і звярнуўся да яго:

— Ваша... ваша высока... вы-ж такі чалавек... вы-ж вялікі, можна сказаць, начальнік... Вашаства... скажыце, што гэта значыць? І што з гэтага можа быць?

«Губернатар» спадылба зірнуў сваімі маленькімі блакітнымі вачыма і развёў рукамі, быццам ад чаго адмахваўся:

— Не ведаю, панове... гм... таварышы... Я такі-ж чалавек, як і вы... просты чалавек, мірны жыхар... Адно толькі ведаю: свет гіне... канчына свету... Людзі падаюць... божа мой, божа...

Усе з ім згадзіліся, быццам з вуснаў яго пачулі словы, якіх толькі і чакалі.

Жыхар Земельман, уласнік мануфактурнага магазіна, сказаў:

— Залатыя словы, ваша... ваша... высока...

— Правільна мелі ласку заўважыць: канчына свету і ёсць.

«Губернатар» павярнуў галаву, але покнуўшы ў гэты момант выбух гарматы скіраваў гутарку на іншую тэму:

— Гэта 14-сантыметравая шрапнель...

— Ого, шрапнель... — паўтарылі жыхары і збіліся ўсе ў кучу.

Жанчыны прадаўжалі гутарку пра харчовыя прыпасы, якімі здолелі запасціся. Як раптам адзін з жыхароў, спахапіўшыся, усклікнуў па-яўрэйску:

— Панове, а што як наш «губернатар» галодны?

— Можа, хто-небудзь спытаецца?

— Дык чаго палохацца? Спытайцеся.

— Чаму-ж я? Спытайцеся вы.

— Як? У такога чалавека?

Тут Рабіновіч, які ўмеў размаўляць з начальствам, стаўшы перад «губернатарам», звярнуўся да яго з наступным, на добрай рускай мове сказаным, словам:

— Ваша высока... мы, жыхары, вас просім... бо для нас такі гонар мець у сваім доме такую асобу... у гэтыя жахлівыя часы.. Спадзяёмся, што гэта скончыцца... мінецца... Гасподзь злітуецца... Просім не адмовіцца завітаць да нашага паважанага грамадзяніна Машковіча, тут на нізу... Ён нас пачастуе па маленькай... Крышку пазабавімся і забудземся на ўсё...

«Губернатар» здаваўся глыбока ўзрушаным. Ён выпраміўся, выставіў па-вайсковаму грудзі і адказаў, як адказваюць на тост:

— Панове, я надзвычайна кранут, вы добрыя людзі. Калі ласка, калі ласка, я заўсёды сцвярджаў, што сярод вас сустракаюцца добрыя людзі... Калі ласка, калі ласка.

Праз колькі мінут жыхары сядзелі вакол стала ў кватэры грамадзяніна Машковіча. На ганаровым месцы сядзеў «губернатар», а поплеч яго расселіся купецкія жонкі. На стале з'явіліся бутэлькі і чаркі. Стралянiна з вуліцы сюды, у залу, даносілася слаба і з тварау паступова спаўзаў страх. Выпілі і закусілі.

«Губернатар» таксама выпіў, абцёр цяжкія вусы, сваімі маленькімі блакітнымі вачыма акінуў усіх, хто сядзеў за сталом, перахапіў натхнёныя, томныя позіркі жанчын і галантна агаласіў тост:

— За здароўе высокапаважаных дам... гм, гм...

Ён яшчэ раз выпіў і дадаў:

— За, за развіццё гандлю... гм, гм...

Раптам ён сказаў:

— Гм... яўрэі, гэта гандлёвы народ...

— Усе мы, ваша высока.. купцы, — уставіў Рабіновіч, — але нашы крамы..

«Губернатар» яшчэ раз выпіў і сказаў:

— Гандлёвы клас мае важнае значэнне для дзяржавы...

— Вядома, вядома... —адабраюча заківалі галовамі прысутныя, — без гандлю свету-б не існаваць...

І зноў напоўнілі чаркі.

«Губернатар» выпіў некалькі чарак запар. Ён пачаў гаварыць гучна, шырока размахваючы рукамі.

— Вельмі добры чалавек! — з заміламаннем адзначылі жыхары. Плячыстая, моцная фігура «губернатара» надавала былым яўрэйскім камерсантам мужнасць і грукат пальбы здаваўся менш пагражаючым.

Тым часам «губернатар» пачаў частавацца сам. Ён напаўняў адну чарку за другой і, быццам фокуснік, перакульваў іх сабе ў рот.

Пачырванеўшы, з выпукленымі бялкамі вачэй, ён нечакана пачаў адрывіста выкрыкваць:

— Што вы сабе думаеце? Я сярдзіты! Хто бунтуе?

Жыхары спалохаліся.

— Не варта было даваць яму гарэлкі, — заўважылі некаторыя, а Рабіновіч паспрабаваў уладзіць «губернатара»:

— Ваша высока... мы прыстойныя, спакойныя людзі... Купцы...

— Пайшоў прэч, жыдоўская морда! — грымнуў раптам «губернатар».

Жыхары адхіснуліся ў бок.. Жанчыны пачалі заламваць рукі, а Рабіновіч урачыста ўсклікнуў:

— Ага? Ці-ж не казаў я вам, што ён — губернатар?

Між тым, губернатар узняўся з месца. Хістаючыся з боку на бок, з вылупленымі бялкамі асавелых вачэй, упёршыся рукамі ў бакі, ён грымеў:

— Я тут гаспадар... я... я.. Ды ці ведаеце вы, хто я? Смірна! Іменем яго імператарскай вялікасці без пардону ўсіх бунтаўшчыкоў — расстраляць!

Усе ў спалоху разбегліся па кутках. І толькі тонкі, пісклявы голас Рабіновіча лямантаваў зводдалі:

— Мы, ваша.., ваша... Мы купцы...

— Жыды, бунтаўшчыкі! — гарлаў губернатар і тупаў нагамі.

Раптам паявілася жонка губернатара, бледная, з раскудлачанымі сівымі валасамі. З-за яе спіны выглядала пара перапалоханых блакітных вачэй. Гэта была дачка.

— Колечка, Коля, Нікалай Андрэевіч! Што з табой? Апамятайся, як можна так забывацца? Не ведаеш хіба, дзе мы знаходзімся?

Абедзве жанчыны абнялі яго і спрабавалі вывесці з пакоя, але губернатар рынуўся, як леў:

— Мая краіна — мая ўлада! Усе мне падначалены Хто страляе? — голас яго ўсё больш узрастаў. — Даві бальшавікоў! — роў ён так, што аж сцены дрыжалі.

Жонка і дачка схапіліся за галовы і расплакаліся. Жыхары паразбягаліся.

Але Рабіновіч знайшоў выхад са становішча. Ён хуценька пабег у кут двара, дзе ў падвальным памяшканні жыла бедная яўрэйка, якая зазвычай прыбірала ў доме пакоі. Праз колькі мінут ён вярнуўся разам з нейкім юнаком год васемнаццаці. Юнак меў чырвоную павязку на рукаве і пры боку, на тонкім раменчыку, рэвальвер. Юнак гэты падыйшоў да губернатара і, стараючыся сваім юнацкім голасам узяць як мага больш нізкую і сур'ёзную ноту, сказаў:

— Таварышы грамадзяне, іменем рэвалюцыйнай законнасці. — супакойцеся!

Губернатар умомант працверазеў. Ён неяк змізарнеў адразу і спрабаваў нават прыкласці руку да казырка:


— Буржуі... Буржуі хацелі падкупіць мяне.. хабарам...

Губернатар паў.

Толькі цяпер усе спазналі юнака. Гэта быў сын беднай яўрэйкі з падвальнага памяшкання.

Жыхары ўспомнілі пра свае пакінутыя, апячатаныя крамы. Блізкая перастрэлка вінтовак і кулямётаў зайграла за варотамі і абітальнікі дома пачалі шукаць, дзе-б схавацца ад куль.

Аўтарызаваны пераклад з яўрэйскай мовы С. ДРЭЙЕРА і Р. ЛЫНЬКОВА.



На занятках мастацкай студыі пры Магілеўскім Доме юных піонераў. Кіраўнік студыі мастак **В. Берзін** (злева) праглядае работу выдатніка вучобы Віці **Пітталава.** Фота А. Вульфовіча (БЕЛТА).

Мастацкая студыя ў Магілеве

Мастацкая рабочая студыя займае адзін з высокіх і светлых пакояў былога губернатарскага палаца. Зараз тут Дом юных піонераў і Дом народнай творчасці. З вокнаў палаца адкрываецца прыгожы від на ўскраіны Магілева. У далечыні, ледзь прыкметна, зелянее лес, бліжэй— істужка Дняпра, а за ёй маячаць высокія каміны соцыялістычнага Магілева.

Магілеўскія мастакі любяць родны пейзаж, любяць прыгожыя ўскраіны роднага горада, любяць масіўныя фабрычныя будынкі, што выраслі тут. І на палотнах маладых мастакоў горада можна пазнаць і гэтыя адкрываючыяся з акна палаца віды, і прамысловае Лупалава, і новы гарадок, які вырас у раёне Шоўкавай фабрыкі.

Студыю арганізаваў тры гады назад абласны Дом народнай творчасці. Увесь гэты час ёю кіруе адзін са старэйшых беларускіх мастакоў К. Н. Гедда. Два разы на тыдзень у гэты прасторны, завешаны рысункамі, карцінамі, антычнымі фігурамі пакой прыходзяць мастакі-самавукі, страсныя любіцелі кісці, выяўленчага мастацтва. Прафесія многіх з іх далёкая ад жывапісу. Адзін працуе інжынерам на Шоўкавай фабрыцы, другі—рабочым у друкарні імя Молатава, трэці—чырвонаармеец. За мальбертам усіх іх еднае любоў да мастацтва, жаданне па меры сваіх сіл і здольнасцей быць карыснымі радзіме яшчэ і кісцю.

Нядзеля. Апоўдні. У студыі заняткі. Тав. Гедда абходзіць вучняў. Адзін студыец прынёс паказаць аўтапартрэт. Гэта тав. Ленглебен—вучань сярэдняй школы, здольны юнак, удзельнік выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» (па раздзелу народнай творчасці). Кіраўнік студыі ўважліва разглядае работу, робіць заўвагі, папраўкі.

Студыйка тав. Ісаевіч рыхтуецца ў мастацкае вучылішча. Чырвонаармеец тав. Купершток (раней ён займаўся ў В. Волкава) мяркуе працаваць над тэматычнай карцінай. Зараз студыйцы рыхтуюцца да 2-й абласной мастацкай выстаўкі. На сцяне, на відным месцы—спіс рэкамендуемых тэм. Шмат іх прысвечана Магілеву.

Тав. Гедда, які нядаўна закончыў новую карціну на гістарычную тэму: «Допыт Пестэля ў Магілеве ў 1826 годзе» любоў да гістарычных сюжэтаў прывівае і сваім студыйцам. Нядаўна студыйцы праслухалі цыкл лекцый па гісторыі мастацтваў.

У гэтым жа памяшканні займаецца і дзіцячая мастацкая студыя пад кіраўніцтвам тав. Берзіна. Старанна выпісваюць юныя мастакі дэталь з натуры, вучацца валодаць алоўкам і кісцю.

Е. САДОЎСКІ.

Магілёў.

М. Модэль

Аб тэатральнасці і пачуцці меры

Пра тэатральнасць у нас пішуць многа. Амаль у кожнай рэцэнзіі, крытычным артыкуле мы знаходзім заўвагі аб тэатральнасці. Гэта праблема цікавіць рэжысёраў, актораў і крытыкаў.

Сапраўды тэатральным з'яўляецца ўсё мастацка-праўдзівае, пераканаўчае, усё тое, што хвалюе і выклікае ў гледача жывыя чалавечыя пачуцці. Гэта аднолькава правільна для ўсіх тэатральных жанраў. Уяўнай тэатральнасцю з'яўляецца імітацыя чалавечых пачуццяў, штучная прыгажосць, знешнія наіўна-тэатральныя эфекты, адсутнасць самага важнага для мастака — «пачуцця меры».

К. С. Станіслаўскі лічыў благім густам, калі ў спектаклі «замест благародства непрыкметна ствараецца напышлівасць, замест прыгожага — штучная прыгажосць, а замест выразнасці — тэатральная эфектнасць». Станіслаўскі ненавідзеў «у тэатры—тэатр і шукаў у ім жывота, сапраўднага жыцця, — не абыдзённага, зразумела, а мастацкага».

Ёсць творчыя работнікі, якія часам, забываючы аб гэтых геніяльных думках Станіслаўскага, аднабакова і няправільна разумеюць тэатральнасць. Для іх тэатральным уяўляецца знешняя відовішчнасць, бляск яркіх сцэнічных фарбаў, багацце наіўных, уяўна-тэатральных эфектаў. Прыгажосць яны разумеюць як напышлівасць. Жывасць яны бачаць у знешняй сцэнічнай дзеі, у мітусні масавых сцэн. Мастацкай праўдай, рэалізмам ім здаецца багатая сцэнічная бутафорыя, імітуючая сапраўдныя бытавыя рэчы. І нечаканай для стваральнікаў такіх спектакляў з'яўляецца зялёная нуда, якая вее ад гэтай напышлівасці і пампезнасці.

Будзем канкрэтнымі. Сёння нас цікавіць спектакль «Калдуння» у Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры БССР. У гэтым спектаклі ёсць тэатральнасць сапраўдная і тэатральнасць уяўная, ёсць праявы сапраўднага мастацкага густу і страта пачуцця меры.

Пастаноўшчык спектакля засл. артыст БССР В. Я. Галаўчынер у супрацоўніцтве з паэтам З. Аксельродам, мастаком Ц. Кіпнісам і кампазітарам Мільнерам шукаў новыя фарбы для гольдфадэнаўскай «Калдунні». Навізна спектакля Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР — у шуканні ўласнай манеры сцэнічнага ўвасаблення «Калдунні», у разгляданні твора Гольдфадэна не як забаўляльнага, як «повады для народнай ігры», а як «паэтычнай легенды аб страчаным і зноў знойдзеным шчасці». Галаўчынер імкнуўся адыйсці ад традыцыйнага тлумачэння наіўна-меладраматычнага сюжэта «Калдунні», якое было ўласціва спектаклям дарэвалюцыйнага яўрэйскага аперэтачнага тэатра. Рэжысёр таксама адмовіўся ад сатырычна-гратэскнага плана, які быў прыменен да «Калдунні» у свой час Маскоўскім Яўрэйскім тэатрам.

У спектаклі паэтычна ўзвышан вобраз «народнага жартаўніка» — карабейніка Гоцмаха (выконвае засл. артыст БССР М. Сокал), увасабляючага мяккі гумар, вясёлае балагурства і сардэчнасць. Тут станоўча сказалася літаратурная апрацоўка і новыя тэксты, асабліва песенныя, З. Аксельрода.

У асобных сцэнах спектакля ёсць рысы сапраўднай тэатральнасці. — напрыклад, святочнасць народнага прадстаўлення (1-я карціна). Цікавы рэжысёрскі замысел адчуваецца ў сыгранай засл. артысткам БССР А. Трэпелем з вялікім пачуццём гумару ролі калдунні і ў некаторых іншых вобразах, — у такім, скажам, паэтычным эпізодзе, як песенька артысткі Чайгорскай пра голубаў.

Але не гледзячы на цікавы замысел і асобныя рэжысёрскія і акторскія ўдачы, спектакль не пакідае ўражання мастацкай закончанасці. Рэжысура страціла пачуццё меры ва ўжыванні такіх «дасягненняў тэатральнасці», як знешняя відовішчнасць і наіўна-тэатральныя эфекты. Імкненне да накаплення відовішчных эфектаў прывяло рэжысуру да змяшэння рознастайных жанраў у адным спектаклі Тут ёсць казачнае і рэальнае, умоўнае і бытавое, гратэск, цырк і эстрада. Другая карціна спектакля (у хаце Басі) — бытавая; трэцяя (на базары) пастаўлена ў стылі пурымшпіля, які з'яўляецца яўрэйскім варыянтам італьянскай камедыі масак; пятая (таемны пакой у хаце калдунні)—умоўна-казачная, шостая (кафэ ў Стамбуле) — экзатычная з цыркавымі фокусамі тыпу ілюзіяніста Кіё.

Такая-ж стракатасць і ў трактоўцы вобразаў.

Мачыха і Аўромце — амаль бытавыя фігуры, Эльёкум і асабліва «калдуння»— гратэскныя, Мірэле — лірыка-сантыментальная і г. д. Што ні акторскі вобраз, то новая манера ігры.

Спектакль пазбаўлен мастацкай цэльнасці, распадаецца на рад часам цікавых, але стылістычна разрозненых эпізодаў.

У некаторых сцэнах асабліва ярка відаць празмернае захапленне красачнасцю і знешняй відовішчнасцю, якая дасягае зусім нечаканых для рэжысуры вынікаў. У сцэне базара надзвычайнае багацце натуральных рэчаў, сцэнічнай бутафорыі. Многа тут не звязаных з сюжэтам вакальных нумароў, якія з'яўляюцца толькі поводам для забаўляльнага відовішча, носяць характар самастойнага эстраднага канцэрта. Сюжэтныя элементы ў гэтай сцэне адыходзяць на другарадны план і з'яўляюцца нібы сумным дадаткам да вясёлага карнавалу.

Жанр «Калдунні» у прынцыпе дазваляе такую будову сцэны, якая ідзе ад «пурымшпіля». Але страчана пачуццё меры і добры замысел ператвараецца ў сваю процілегласць.

«Калдуння» была заўсёды музыкальным спектаклем. Гольдфадэн сабраў і апрацаваў многа цёплых і задушэўных народных мелодый. Музыка да спектакля напісана і інструментыравана кампазітарам Мільнерам. Кампазітар праявіў тут менш мастацкага густу і арыгінальнасці, чым у музыкальным афармленні спектакля «Дос клейне ментшэле». Музыкі — аркестровай, харавой і асабліва для сольнага вакалу — напісана празмеру многа. Тут ёсць нават меладычны рэчытатыў, які надае непатрэбную «опернасць» гэтаму спектаклю.

Вялікая колькасць разрозненых вакальных нумароў значна перашкодзіла артыстцы М. Фрыдман у стварэнні вобраза Мірэле. Артыстка амаль на працягу ўсяго спектакля вымушана спяваць, нават у звычайных рэальных сітуацыях, дзе гледачу хочацца пачуць жывое слова пакутуючай Мірэле. Праўда, к гонару артысткі трэба сказаць, што, перамагаючы «оперную» умоўнасць ролі, яна ўсё-ж даносіць да гледача жывое чалавечае пачуццё.

Захапленне знешняй прыгажосцю ў спектаклі праяўляецца і ў стракатасці фарбавай гаммы дэкарацый і касцюмаў, у карцінных позах асобных масавых сцэн. Жывое ўзаемадачыненне актораў у некаторых масавых сцэнах (на базары, «работа» запалоненых калдунняй) скавана строгім музыкальным рытмам.

Законы опернага тэатра нельга механічна пераносіць у драматычны тэатр. Заканамерную для музыкальнага тэатра ўмоўнасць у драматычным тэатры мастацка апраўдаць немагчыма. Нельга апраўдаць штучную опернасць «Калдунні» вызначэннем яе жанру як музыкальнай п'есы. Такое вызначэнне надта агульнае і цьмянае і, па сутнасці, нічога не растлумачвае, таму што музыкальнай п'есай могуць называцца рознастайныя **музыкальныя** творы.

В. Я. Галаўчынер у прысвечаным пастаноўцы «Калдунні» артыкуле ў газеце «Октябр» назваў гэты твор паэтычнай легендай. З такім тлумачэннем «Калдунні» можна было-б згадзіцца, калі-б спектакль быў не толькі дэклараваны, а і вырашан у плане паэтычнай легенды. Аднак, нажаль, спектакль нас у гэтым сэнсе крыху расчароўвае. Паэтычнасць — зноў падкрэсліваем гэту думку, — ёсць у спектаклі — у вобразе карабейніка Гоцмаха. У ігры М. Сокала, можа і не зусім традыцыйнай, ёсць шчырае і цёплае чалавечае пачуццё. У яго жартах і гумары шмат горычы, а ў вясёлым балагурстве часта чуюцца трагічныя ноткі. Здарылася так, што паэтычная індывідуальнасць актора ўзбагаціла і ўзвысіла вобраз М. Сокал дапамог Галаўчынеру вырашыць частку пастаўленай задачы.

Але, нажаль, паэтычнасць толькі частка цэлага, а не ўласцівасць усяго спектакля. Ёсць насычаныя музыкай і рухам дынамічныя сцэны, ёсць у ім элементы плашчаднога відовішча, а ёсць і зусім шэрыя, сумныя сцэны, якія выпадаюць з агульнага плана. Паслядоўнаму ажыццяўленню свежага і цікавага рэжысёрскага замыслу перашкодзіла страта пачуцця меры і захапленне знешняй уяўнай тэатральнасцю.



Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР паказаў прэм'еру оперы «Травіята» Д. Вердзі. На здымку: Віялетта — засл. артыстка БССР **Л. Аляксеева,** Альфрэд — засл. артыст БССР **В. Лапін.** Фота І. Капліскага.

С. Дрэйер

Эфроім Каганоўскі



Э. Каганоўскі.

З часу свайго дэбюту ў літаратуры ў 1909 годзе двума апавяданнямі, надрукаванымі ў зборніку «Ідыш», які выдаваўся класікам яўрэйскай літаратуры І. Перацам, да нашых дзён Эфроім Каганоўскі ў розных перыядычных выданнях і трох сваіх кнігах — «Дзверы акна» (1922), якая вытрымала 4 выданні, «Беззаветна» (1927) і «Фігуры» (1937)—нязменна ўдасканальвае абраны ім літаратурны жанр — навелу, у якім дасягнуў вялікага майстэрства.

Э. Каганоўскі — одэсіт. Вырас ён і рабіў свае першыя крокі ў літаратуры ў асяроддзі моцнай яўрэйскай пісьменніцкай групы, якая стварылася ў Одэсе ў пачатку цяперашняга стагоддзя (там у той час жыў і працаваў «дзядуля яўрэйскай літаратуры» Мэндэле). Потым Э. Каганоўскі жыў усесь час у Варшаве, у акружэнні яўрэйскай мяшчанскай стыхіі, пад заўсёдным абстрэлам ваяўнічай рэакцыі, мракабесся і бескультур'я. Густ чытачоў гэтага асяроддзя быў непатрабавальны. Надзвычай чуллівая пісьменніцкая структура Э. Каганоўскага ўспрымала гэта вельмі хваравіта. Знешне здавальняючы патрабаванні чытацкага рынку, Э. Каганоўскі тым часам тонкім пяром сатырыка бічуе безгустоўе і пошласць акружаючага яго мяшчанства.

У сваіх мініяцюрах, у якіх наогул няма дзе разгарнуцца шырокаму свету, дзе няма прасторы для вялікіх палотнаў, пісьменнік пераважнае месца аддае чалавеку. Філіграныя псіхалагічныя рысункі, кволая, ледзь улоўная сетка ўзаемаадносін паміж людзьмі, біялагічная цэпкасць аджываючага складаюць не толькі жывую тканіну навел Э. Каганоўскага, але і іх сэрца, іх кроў. Прыгажосць іх складаюць не адзін займальны, часам жартлівы, часам крапальны сюжэт, але і пранізваючы іх радкі настрой, чароўнасць іх падтэксту.

Скрыжаванне ўплываў акружаючага асяроддзя і асабістага стану душы пісьменніка стварылі сваё асаблівую творчую індывідуальнасць, цікавую, хоць далёка не ўсёабдымную, некалькі аднабокую як па жанру, так і па тэматыцы.

Характэрны матыў праходзіць праз усю творчасць Э. Каганоўскага — паказ заката жыцця, жыцця адыходзячага, але ўзятага не ў аспекце замагільнасці — Э. Каганоўскі ўсюды і заўсёды рэаліст,— а ў самым звычайным бытавым значэнні («Бабка з Прагі», «Некалі», «Дзядзька Генрык»). Адыходзячае жыццё кідае водбліскі то ўспыхваючага, то тлеючага святла не толькі на людзей, але і на неадухаўлёныя прадметы, і ў гэтым адлюстраваным мёртвенным святле самі людзі пачынаюць некалькі пахнуць мяртвечынай. Вось як пачынаецца адна з навел Э. Каганоўскага:

«У вялікім сярэднім пакоі старога дома і ўлетку і ўзімку холадна. Тут лунае дух пустаты, які патыхае пахам старых былых людзей, нібы нехта збег адсюль навекі.

Тут стаіць цяжкі вялікі стол і старыя, мяккія, быццам апухлыя крэслы, вялікі раяль, а на сценах два вялікіх партрэты — павялічаныя фатаграфіі пажылога яўрэя ў ярмолцы і з круглай белай барodкай і жанчыны з вялікай брошкай пад цяжкім падвойным падбародкам. Гэта старыя гаспадары гэтага дома». («Яўрэйскія горніцы»).

Такім чынам пісьменнік уводзіць нас у атмасферу нейкага затрыманага руху жыцця на парозе магілы, дзе спіраецца цмяная мяжа паміж быццём і небыццём. І ўсё-такі гэта—жыццё, нават асабліва ўпартае і прагнае. Вось гэта з'ява чалавечай жывучасці не перастае займаць Э Каганоўскага, як з'ява асобага бытавога і псіхалагічнага парадку.

Але, з другога боку, усё гэта выклікае мысль аб зменнасці свету, аб працэсе вечнага абнаўлення. І побач са здранёвасцю мінулага вырысоўваюцца цмяныя контуры будучага. Поруч са старасцю выступае змена, хоць і ў менш канкрэтным увасабленні. Праўда, і гэта маладое ў Э Каганоўскага па сваёй жыццёздольнасці ўжо ў зародку нясе сабе пагібель, бо людзі яго па сваёй соцыяльнай фармацыі належаць у большасці да асуджанага на знікненне грамадства. Нават дзеці, чароўныя, нейкія асаблівыя дзеці ў нямногіх дзіцячых апавяданнях Э. Каганоўскага («Цётка Галаса», «З дзіцячага»), адзначаны гэтай пячаткай асуджанасці.

Навелы Э. Каганоўскага па свайму сюжэту, па сваёй танальнасці ўяўляюць давoлі рознастайную гамму. Некаторыя з іх характэрны тонкай іранічнай назіральнасцю, нейкім журботным гумарам (гэта ад Чэхава), іншыя — жартаўлівасцю зместу і псіхалагічнай трапнасцю (гэта ад Мапасана). Ёсць у Э. Каганоўскага яшчэ асобы свет, далёкі ад гібеючага свету Штраус-Федэраў, ад гаснучага існавання старога Морыца. Гэта свет здаровых, грубаватых інстынктаў, земнай сілы цела. З чуццём стылю, веданнем быту, пранікненнем у псіхіку выводзіць Э. Каганоўскі людзей з самай гушчы народных мас, з люмпенпролетарыята, з той соцыяльнай праслойкі, якая ў спецыфічных умовах яўрэйскага асяроддзя ўяўляла багацейшую крыніцу жывой энергіі, а часам і гераізму залежы чыспейшага фальклору. Хоць у сваёй творчасці Э. Каганоўскі не праяўляе актыўнай соцыяльнай запікаўленасці, але ў паказе людзей гэтага асяроддзя, у вобразах Гітл, Янавай—шмат цеплыні і спагады, асветленай мудрай жыццёвай усмешкай, што разам узятае складае чароўнасць лепшых навел пісьменніка.

Стварэнне гэтай чароўнасці, у спалучэнні з займальнасцю апавядання, належыць да «сакрэтаў вытворчасці» Э. Каганоўскага. З іншых сродкаў мастацкага ўздзеяння і паказу трэба адзначыць яго арыгінальныя метафары, што выкрываюць фактуру жывапісца, але далёкі ад звычайнай банальнай, заношанай «жывапіснасці». З-за гэтага вобразнасць выражэння ў творах Э. Каганоўскага набывае не толькі характво навізны і нечаканасці, але і асаблівую эмацыянальную сілу. Органы пяці пачуццяў выходзяць з натуральных межаў, адны пачуццёвыя адчуванні ператвараюцца ў іншыя, слыхавыя — ў зрокавыя, асязальныя, абаняльныя і наадварот. Вось некалькі прыкладаў:

«Яго вялікі белы лоб з белакурымі **слабымі** валасамі вакол бледнай, плоскай лысіны выклікаў пачуццё **нуды...**»

«Ён няўважліва паглядзеў на мяне, быццам спалохаўся, і я ўпершыню пачуў яго **бялёсы,** слабы голас».

«... Чуліся два галасы: адзін **калючы,** з **голымі** выкрыкамі ў канчатках слоў другі—**жоўты, бледны,** але нутраны».

***

На вялікім павароце гісторыі Э. Каганоўскі пакінуў за сабою адыходзячы за межы быцця і небыцця свет,—свет, у якім змрокі панавалі ў грамадскім жыцці і ў душы асобнага чалавека, свет мінулага. У гэтым свеце Э. Каганоўскі не ўбачыў той сакрушальнай і творчай сілы, якую ўяўляе сабою рабочы клас. Барацьба пролетарыята, авангарда прапоўнага народа, яго гістарычны лёс, яго чаканні і мэты—усё, чым жыве перадавое чалавецтва,—засталося па-за яго ўвагай. Таму ў творчасці Э. Каганоўскага няма таго сцвярджэння жыцця, якое можна было знайсці ў духоўнай сувязі з змагаючымся класам, што ва ўмовах капіталізма, цаною непамерных наматанняў і шматлікіх афяр, непарыўна ідзе на штурм загніваючага свету.

Куды-ж за гэтым гістарычным паваротам павядзе творчы шлях Э. Каганоўскага, гэтага таленавітага мастака слова?

Э. Каганоўскі неяк сам даў пэўны адказ на гэта пытанне:

«Той перыяд, калі фарміравалася маё светаўспрыняцце, адносіцца да рамантычнага рэвалюцыянізма, які ў Польшчы знайшоў удзячную глебу. З аднаго боку, жыццё яўрэйскіх мас пры царызме, з другога—польская нацыянальная рамантыка сустрэлі ва мне глыбокі водгук, але вайстрае пачуццё натуральнасці (так званы рэалізм) зберагло мяне ад польскай рыторыкі і наблізіла да рускіх уплываў. Сваю мастацкую культуру я ўзяў ад жывапісу. Думаю, што добрае мастацтва— гэта шляхетнасць пачуццяў, дабрата, душэўная чыстата і вера ў чалавека.

Абстаноўка, якая вырасціла мяне, — краіна, у якой я жыў, народ, да якога я належаў, клас, з якога выйшаў,—навучыла мяне баяцца. Усё вакол здавалася мацнейшым за мяне. Вось гэта вучэнне баязні спрыяла ўзнікненню ў мяне комплексу песімізму, бачання жыцця ў яго адыходзе: жыццё канчаецца, усё адыходзіць. На гэтай фінальнай ноце я пабудаваў большую частку сваіх апавяданняў.

Савецкае ўспрыняцце свету абудзіла ва мне веру, што жыццё таксама пачынаецца, і гэта новае адкравенне ды будзе-ж маім путяводцам у маёй далейшай творчасці».

Паўрад ці вытрымалі-б усе фармуліроўкі гэтай споведзі выпрабаванне ўдумлівага крытычнага аналізу. Але падкупляе ў ёй шчырасць выказвання. Важна ў ёй не дакладнасць характарыстыкі гісторыка-літаратурных з'яў, а праўдзівасць вызначэння ўласнай унутранай сутнасці, самавызначэння пісьменніка. А сюды ўваходзяць і яго пошукі новага, жыццёсцвярджаючага пачатку.

Характэрна, што на савецкай зямлі навеліст Э. Каганоўскі ўпершыню прыступае да твора вялікай формы—да шырокага палатна з эпохі грамадзянскай вайны на поўдні Расіі. Гэты новы твор, наколькі можна меркаваць па ўрыўках, можа вырасці ў твор ідэйнай высаты, жыццёвай праўды і мастацкай сілы.

Гэта быў-бы далейшы, значна вышэйшы этап на творчым шляху таленавітага пісьменніка.



У Мінскім Тэатры Чырвонай Арміі паказвае свае спектаклі тэатр «Камедыя» Цэнтральнага Дома Чырвонай Арміі імя Фрунзе. **На здымку:** сцэна з камедыі Кальдэрона «Дама-невідзімка». У ролі доньі Анхелы арт. **Е. Талубеева**, у ролі дон Мануэля арт. **Л. Бунін**. Фота І. Каплінскага.

Тэатральная самадзейнасць Беластоцкай абласці

Праведзены агляд паказаў выключна вялікі размах тэатральнай самадзейнасці ў Беластоцкай вобласці.

У працэсе падрыхтоўкі да агляду абласны Дом народнай творчасці аказаў калектывам самадзейнасці вялікую арганізацыйную і творчую дапамогу. Выконваючы рашэнні X пленума ВЦСПС, да кіраўніцтва драмгурткамі прыцягнуты грамадскія кіраўнікі. Разгарнулася шэфская работа. Рад творчых работнікаў—рэжысёры і акторы мясцовых тэатраў шэфствуюць над гурткамі тэатральнай самадзейнасці.

У аглядзе прынялі ўдзел больш 100 гурткоў самадзейнасці, якія ахапляюць каля 2.000 выканаўцаў па 23 раёнах вобласці.

У Гродненскім раёне агляд быў закончан 10 лютага. У гарадскім тэатры ў Гродні сваё майстэрства дэманстравалі калектыў тэатральнай самадзейнасці вёскі Каўпакі, Капцёўскага сельсовета, які паказаў «У пушчах Палесся» Я. Коласа, калектыў хаты-чытальні вёскі Грандзічы, які паставіў «Прымакі» Янкі Купалы, калектыў ДСК мястэчка Індура, які паказаў п'есу «Дзвесце тысяч» Шолам-Алэйхема.

Два дні доўжыўся другі тур агляду ў раёне, а потым адбылося абмеркаванне спектакляў удзельнікамі агляду сумесна з прадстаўнікамі партыйных, комсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, работнікаў мастацтваў.

— Ці-ж мы, маленькі вясковы гурток,—гаворыць кіраўнік гуртка вёскі Каўпакі тав. Міхайлоўскі,—маглі марыць аб такім шчасці—іграць у Гродні, у вялікім тэатры!..

З вялікім уздымам прайшоў агляд і ў Заблудаўскім раёне. Тут перад грамадскасцю прадэманстравалі свае дасягненні драмгурткі тэкстыльнага камбіната № 9 у Міхалаве, гурток тэкстыльнага камбіната № 10 у Гарадку, гурткі клуба Плевіцкага сельсовета, лесазавода ў Валілах і інш.

У Беластоку ў аглядзе прымалі ўдзел 17 калектываў, сярод іх драмгурткі Цэнтральнага клуба тэкстыльшчыкаў (кіраўнік тав. Юнін), Беластоцкага тэкстыльнага трэста (кіраўнік тав. Скіпетрава), тэкстыльнага камбіната № 3 (кіраўнік тав. Юдаік), тэкстыльнага камбіната № 2 (кіраўнік тав. Савіцкі), «клуба чыгуначнікаў» (кіраўнік тав. Сотасаў).

Мастацкая самадзейнасць заходніх абласцей БССР за кароткі час дасягнула значных поспехаў. Творчая ініцыятыва працоўных, таленты народа атрымалі поўную магчымасць развівацца, будаваць культуру, нацыянальную па форме, сацыялістычную па зместу.

В. БУБРЫК.
Ст. метадыст Дома народнай творчасці Беластоцкай вобласці.



Тэатральная самадзейнасць Мінска. «Наша сям'я» М. Гінгольда ў пастаноўцы яўрэйскага драматычнага калектыва фабрыкі імя Кагановіча. У ролях: Соня — **Брыкер**, Нотэ-Герш — **Абельсон**, Сімхе Цымбал — **Гінгольд**, доктар — **Фрыдман**. Фота І. Каплінскага.

Арк. Гейне

Пагібель павер'я

Ёсць павер'е: калі вёдры без вады
Пранясуць табе насустрач, — жди бяды!
Казала ты аб тым мне не раз,
Калі з вёдрамі ў шляху страчалі нас.
І даўно цябе з тых пор не бачыў я.
А прыехаў і — сустрэў ля ручая:
Ты ўзыходзіла павольна пад гару,
У руках тваіх — па поўнаму вядру;
Нечаканая сустрэча! У той-жа міг
Вёдры бразнулі, вада пабегла з іх...
— Ой, дзяўчына, нарабіла-ж ты бяды!
Сустракаеш, ну, а вёдры — без вады...
Ты-ж махнула абыякава рукой:
— Шчасце наша не расплешчацца з вадой...
І з часіны той ніколі, сапраўды,
У жыцці не сустракалі мы бяды.

Мінск.

Гастролі тэатраў

Надыходзячы летні гастрольны сезон абяцае быць плодатворным для тэатраў і цікавым для гледачоў. Праз некалькі тыдняў на гастролі ў нашу рэспубліку прыедзе рад тэатраў братніх рэспублік Савецкага Саюза.

Першым, хто наведае нашу рэспубліку, будзе Дзяржаўны драматычны тэатр Карэла-Фінскай ССР. Тэатральны глядач Савецкай Беларусі пазнаёміцца з творчым ростам тэатра адной з самых маладых савецкіх рэспублік, пазнаёміцца з адоранымі акторамі карэла-фінскага народа.

Для абслугоўвання працоўных Мінска і абласных цэнтраў нашай рэспублікі ў гэтым годзе да нас прыязджае Ленінградскі драматычны тэатр імя Ленсовета.

Асабліва цікавымі абяцаюць быць гастролі Одэскага тэатра Рэвалюцыі, які пакажа рад класічных твораў і п'есы лаўрэата Сталінскай прэміі А. Карнейчука: «Багдан Хмяльніцкі» і «У стэпах Украіны».

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР распрацавала план культурнага абслугоўвання працоўных гарадоў і раённых цэнтраў нашай рэспублікі. У Віцебскай, Магілеўскай і Палескай абласцях будзе гастраліраваць драматычны тэатр Смаленскай вобласці, а ў Вілейскай і Пінскай абласцях — Вяземскі рускі драматычны тэатр.

Вялікі сезон на гастрольных паездках прадстаіць правесці нашым беларускім тэатрам. Яны наведаюць рад рэспублік і гарадоў Савецкага Саюза, дзе таксама пакажуць свой творчы рост, пазнаёмяць савецкага гледача з творчасцю беларускага тэатральнага мастацтва.

У Выбарг і Петразаводск выедзе Другі Дзяржаўны драматычны тэатр БССР. Працоўным Карэла-Фінскай рэспублікі тэатр пакажа рад класічных твораў і арыгінальныя п'есы К. Чорнага «Ірынка», В. Вольскага «Несцерка» і інш.

У гастрольнай паездцы будзе і Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР. У Ленінградзе тэатр пакажа «Пікавую даму», «Травіяту», а таксама беларускія оперы «Міхась Падгорны» і «У пушчах Палесся».

Гледачу Одэсы і Беластока пакажуць сваё майстэрства акторы Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра БССР. У часе гастроляў тэатр пакажа спектаклі «Партызаны», «Хто смяецца апошнім», «Пагібель воўка», «Ірынка» і інш.

Летнія тэатральныя гастролі па Украіне правядзе і Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР.

На 45 спектакляў выязджае ў гор. Кіраў і на столькі-ж у сталіцу Малдаўскай ССР — гор. Кішынёў Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР.

Вялікая работа чакае тэатры заходніх абласцей. У Смаленску і Смаленскай вобласці будзе гастраліраваць Пінскі абласны беларускі драматычны тэатр, у Мінскай і Гомельскай абласцях—Баранавіцкі абласны беларускі драматычны тэатр. У заходніх абласцях рэспублікі правядзе свае гастролі Брэсцкі абласны рускі драматычны тэатр.

У Мінску і радзе іншых гарадоў БССР будуць гастраліраваць Дзяржаўны Польскі драмтэатр і Дзяржаўны Рускі драмтэатр. Тэатр юнага гледача будзе абслугоўваць піонерскія лагеры рэспублікі. Беластоцкі яўрэйскі драмтэатр будзе гастраліраваць у Гомелі, Віцебску, Магілеве, Бабруйску, Смаленску і Смаленскай вобласці.

Дзяржаўнаму яўрэйскаму тэатру мініяцюр прадстаіць правесці гастролі ў Маскве, Кіеве, Одэсе і на курортах Савецкага Саюза.

Падрыхтоўка да летняга гастрольнага сезона 1941 года вядзецца ва ўсіх тэатрах рэспублікі. Нашы тэатры азнаёмяць працоўных гарадоў Савецкага Саюза з квітнеючым мастацтвам беларускага народа.

Р. ГУРВІЧ.

Прэм'ера Пінскага тэатра

Пінскі абласны тэатр паставіў камедыю «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага. У галоўных ролях заняты маладыя артысты, якія з цяжкай работай трактоўкі вобразаў гэтай складанай п'есы Астроўскага справіліся ўпэўнена.

Артыстка Абрашкевіч пераканаўча раскрывае вобраз Отрадзінай, скромнай жанчыны, горача любячай, але прымушанай хаваць сваё каханне ад людзей. З пачуццём праўдзівасці актрыса трагічныя сцэны. Але там, дзе перад намі прадстае Кручыніна — чалавек, стомлены жыццём, — актрыса не можа захаваць цэльнасці, праўдзівасці вобраза.

Выклікае сумненне трактаванне вобраз Нязнамава ў выкананні артыста Кір'янава. Пастаноўшчык спектакля П. Данілаў і актор трактуюць Нязнамава вельмі прымітыўна. На сцэне — юнак з белакурай галавой, які пакорліва перажывае ўсе несправядлівасці. Відавочна, рэжысёр не ўлічыў, што цяжкія выпрабаванні малецтва і юнацкіх год выхавалі ў Нязнамаву думкі і пачуцці рэзкага пратэсту супроць свету Мухабоевых, Карынкіных і пустых Мілаўзоравых. Нязнамаў не абмяжоўваецца пакорлівым прыняццем грамадскай несправядлівасці, а з усёй сілай мыслі і страсці пратэстуе супроць гэтага. Толькі раскрыццё гэтага боку вобраза, паказ маральных якасцей Нязнамава, яго становішча ў грамадстве можа даць вобразу належную паўнату. Устаноўка-ж на паказ пакрыўджанага, пакутуючага юнака, натуральна, нараджае непатрэбны сантыменталізм і меладраму.

Вобраз Шмагі выражан артыстам Яворскім змястоўна і цікава. Актор правільна раскрывае галоўную мысль, што Шмага таксама без віны вінаваты. Цікавы вобраз Карынкінай стварыла артыстка Аўсіевіч, выкрыўшы ўбогую сутнасць Карынкінай з яе дробнай зайздрасцю і рэўнасцю да Кручынінай.

Вобраз Мілаўзорава артыстам Міхайлавым недапрацаван. Акторам знойдзены пакуль толькі знешнія рысы вобраза.

Такім чынам, спектакль патрабуе істотнай дапрацоўкі па лініі ўзмацнення драматычнай лініі спектакля і эмацыянальнай насычанасці яго, дапрацоўкі асобных ролей і сцэн (асабліва фінала). Недахопы не змяншаюць у многім добрай работы калектыва над п'есай, але яны сведчаць аб тым, што ў дадзеным спектаклі калектыў не выкарыстаў усіх сваіх магчымасцей.

Пінск. **Х. РАСКІН.**

Дзейсна дапамагаць самадзейнасці

Пераважная большасць актораў-прафесіяналаў прыйшла на сцэну з асяроддзя мастацкай самадзейнасці. Старэйшае пакаленне актораў не заўсёды вучылася ў тэатральных школах, якіх да рэвалюцыі было мала і даступны яны былі не для ўсіх. Пачатак развіцця таленту і любві да сцэны звычайна адносіцца да «любіцельскіх» гурткоў.

Ніякай дапамогі з боку актораў-прафесіяналаў гэтыя «любіцелі» не мелі. Наадварот, на «любіцеля» глядзелі як на канкурэнта. Я памятаю, што калі гурток гімназістаў, у якім я іграў, ператварыўся ў поўпрафесіянальны тэатр, які ўлетку 1917 года працаваў у Одэсе, тагочасны Саюз тэатральных работнікаў катэгарычна адмовіўся прыняць нас, маладых актораў, у члены саюза.

Іншая справа цяпер. Дапамога актораў-прафесіяналаў удзельнікам мастацкай самадзейнасці зрабілася, асабліва пасля звароту народных артыстаў СССР т.т. Барсавай і Масквіна, пачэсным абавязкам кожнага савецкага актора.

На прайшоўшай рэспубліканскай нарадзе па шэфству над мастацкай самадзейнасцю мала было практычных прапаноў, абмену вопытам і канкрэтных рашэнняў. І, як здаецца, справа пакуль мала пасунулася ў бок практычнай арганізацыі дапамогі калектывам мастацкай самадзейнасці.

Калектывы мастацкай самадзейнасці, у сваю чаргу, недастаткова прыцягваюць да работы вопытных радавых работнікаў тэатраў. Вельмі часта буйны музыкант, бліскучы вакаліст не можа быць нават пасрэдным педагогам, а адароны актор—нават дрэнным рэжысёрам. А для таго, каб па-сапраўднаму дапамагчы мастацкай самадзейнасці, трэба быць хоць у некаторай ступені і рэжысёрам і педагогам. Актор, які дапамагае мастацкай самадзейнасці, не павінен абмяжоўвацца так-званымі «кансультацыямі», а прысутнічаць пры першай чытцы. У часе чыткі за сталом ён можа дапамагчы выканаўцам ролей раскрыць вобраз. Патрэбна прысутнічаць і на рэпетыцыях гуртка, дапамагаючы і кіраўніку і выканаўцам ролей.

Беручы на сябе абавязак шэфстваваць над мастацкай самадзейнасцю, трэба не абмяжоўвацца ўрачыстымі абяцаннямі, а рэгулярна і добрасумленна працаваць, даводзячы ўсё пачатае да канца.

Мастацкая самадзейнасць—неад'емная і арганічная частка савецкага мастацтва, яго надзвычай масавая частка. Работнікі мастацтваў не на словах, а на справе павінны дапамагчы далейшаму развіццю мастацкай самадзейнасці.

А. АСТАХАЎ.
Заслужаны артыст БССР.

„Без віны вінаватыя“ ў Дзержынскім тэатры

У канцы снежня мінулага года ў Дзержынску (Мінская вобласць) пачаў сваю дзейнасць новы калгасна-саўгасны тэатр. Артысты тэатра ў асноўным — выхаванцы Мінскіх аднагадовых тэатральных курсаў. За параўнальна кароткі перыяд яны падрыхтавалі і паказалі калгаснаму гледачу спектаклі: «Настаўнік» Герасімава, «Мой сын» Гергеля і Літоўскага і інш.

На-днях адбылася прэм'ера спектакля «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага. Спектакль быў цёпла прыняты гледачом.

Пастаноўка п'есы «Без віны вінаватыя» у Дзержынскім калгасна-саўгасным тэатры з'яўляецца значнай творчай удачай маладога калектыва. Пастаноўшчык спектакля — мастацкі кіраўнік тав. Канавалаў і ўвесь калектыў тэатра прарабілі вялікую работу і стварылі каштоўны і цікавы для савецкага гледача спектакль.

Артыстка Рэпніна праўдзіва раскрыла глыбокі вобраз актрысы Кручынінай. Хацелася-б толькі большай непасрэднасці ў першым акце. Артыст Ефрэмаў не знайшоў яшчэ патрэбных сродкаў для таго, каб раскрыць складаны вобраз Нязнамава. Удала выступілі артысты: Ерпічава ў ролі Шалавінай, Латакурскі ў ролі Мілаўзорава і Ржэцкі ў ролі Шмагі.

Не гледзячы на некаторыя недапрацоўкі ў спектаклі, якія выцякаюць з таго, што калектыў выканаўцаў яшчэ вельмі малады, Дзержынскі калгасна-саўгасны тэатр, безумоўна, прарабіў вялікую творчую работу і мае ўсе даныя, каб карыстацца ўвагай і любоўю свайго гледача.

А. ВАСІЛЬЕЎ.
Дзержынск.

Здольны калектыў

На спектаклі маладых драматычных гурткоў я заўсёды іду з пэўным непакоем. Цяжкія тэхнічныя ўмовы, у якіх працуюць гэтыя гурткі, непрыстасаванасць сцэны, не досыць спрактыкаваны склад выканаўцаў — усё гэта можа звесці на нішто самыя лепшыя намеры. Небяспека ўзрастае яшчэ больш, калі гурток бярэ драматычны твор, які пабудаваны на незнаёмым матэрыяле і закранае складаныя псіхалагічныя праблемы, — твор, не лёгкі нават для вопытных актораў.

З такім пачуццём непакою ішоў я на паказ «Вассы Жэлезновай» М. Горкага ў драматычным гуртку Беластоцкай гуты. Тым большым было радаснае ўзрушэнне, якое ахапіла мяне з першай хвіліны падняцця заслоны і не пакідала да канца спектакля.

Ролю Вассы выконвае работніца А. Місюк. Глядач бачыць моцную жанчыну, якая трымае ў сваіх руках гандлёвае прадпрыемства, падуладных і ўсю сваю сям'ю, жанчыну драпежную і непахісную, якая халоднакроўна робіць злачынствы, каб унікнуць скандалу, які можа пашкодзіць яе «добраму імю» і інтарэсам. Яна з вялікай сілай змагаецца з нявесткай-рэвалюцыянеркай за дзіця свайго сына, каб захаваць яго для свайго класа, і пачуцці маці глухнуць у ёй перад класавым інстынктам. У інтэрпрэтацыі А. Місюк яна — яскравы прадстаўнік свайго класа. Дасканалы і моцны голас, рухі, поўныя рашучасці і волі, міміка, якая выяўляе ўсё, што робіцца ў душы гэтай чалавечай пачвары, — усё, аж да драпежнага жэсту сціснутых пальцаў, стварае адналітны, поўны і глыбока драматычны вобраз.

Не меншай пахвалы заслугоўваюць іншыя выканаўцы. Тав. Пракоп вельмі ўдала выконвае ролю Людмілы. Тав. Кравец стварыў выдатны вобраз Пяцёркіна. Вельмі добры і тав. Дэнбскі ў ролі Прохара (можа, толькі крыху манатонны), як, бадай і ўсе астатнія выканаўцы. Ёсць у спектаклі адна слаба выкананая роля — рэвалюцыянеркі Рашэлі, — выканальніца гэтай ролі зрабіла залішне моцны націск на рэзанёрства.

Поспех спектакля ў значнай ступені залежыць ад удумлівай работы рэжысёра Сегаловіча, які стала кіруе гуртком. Спектакль сведчыць, што рэжысёр і гурток ідуць правільнай дарогай, асноўную ўвагу звяртаючы на псіхалагічнае раскрыццё вобразаў, на аналіз асяроддзя, у якім адбываецца дзея.

Г. ПАНСКІ.
Беласток.

У абароннай камісіі ССП БССР

Праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР нядаўна аднавіла абаронную камісію ССП у новым складзе. У яе ўвайшлі: паэт-ордэнаносец Пятрусь Броўка (старшыня), празаік Е. Садоўскі (адказны сакратар), батальённы камісар М. Кручкін, прадстаўнік Упраўлення прапаганды ЗахАВА інтэндант 2 ранга В. Глазырын, крытык Г. Бярозкін і яўрэйскі паэт Л. Талалай.

Сваю работу абаронная камісія ССП накіравала на выяўленне кадраў чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў у часцях ЗахАВА, на аказанне дапамогі часцям акругі ў напісанні сваіх баявых гісторый і на падрыхтоўку да Усесаюзнай нарады па абароннай літаратуры ў Маскве.

У часцях ЗахАВА, як устанавіла абаронная камісія, ёсць дзесяткі здольных маладых паэтаў і празаікаў, якія групіруюцца вакол чырвонаармейскіх газет і шматтыражак, працуюць у літаратурных гуртках пры чырвонаармейскіх клубах. Пішуць вершы і друкуюцца чырвонаармеец А. Панамароў, малодшы сержант Тарас Маручэк, курсант Павел Сіненка, курсант В. Бурмістраў (аўтар паэмы «Савецкі воін») і інш. Ёсць шмат празаікаў. Абаронная камісія вырашыла аказаць кансультацыйную дапамогу гэтым таварышам.

Абаронная камісія стварыла чатыры літаратурных брыгады ў складзе пісьменнікаў М. Лынькова, К. Чорнага, П. Броўкі, П. Глебкі, К. Крапівы, І. Гурскага, Г. Бярозкіна, К. Цітова, Е. Садоўскага і інш. для дапамогі часцям у напісанні сваіх баявых гісторый.

Група пісьменнікаў (тт. Аляксееў, Шапіра, Садоўскі) выступала на вечары, арганізаваным для жонак камначскладу ў клубе рэдакцыі «Красноармейская правда».

У красавіку Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпускае альманах рускіх пісьменнікаў «Расцвет», у якім шырока прадстаўлена творчасць абаронных пісьменнікаў БССР.

С.

У секцыі дзіцячай літаратуры

23 сакавіка ў мінскім Доме пісьменніка адбыўся сход секцыі дзіцячай літаратуры, прысвечаны абмеркаванню работы журнала «Іскры Ільіча». Даклад аб рабоце журнала зрабіў тав. Канстанцінаў. У спрэчках прынялі ўдзел Зм. Бядуля, В. Вольскі, Я. Маўр, А. Якімовіч. Х. Мальцінскі і інш.

У спрэчках было адзначана, што «Іскры Ільіча», адзіны ў БССР журнал для дзяцей, не меў свайго твару. Мала адлюстроўвалася ў ім тое, што характэрна для жыцця Савецкай Беларусі. На старонках журнала друкаваўся часам выпадковы матэрыял, які трапляў у рэдакцыю самацёкам. Больш чым трэба друкаваліся ў журнале перакладныя матэрыялы.

Выказана пажаданне, каб журнал быў больш арганізаваным. Больш увагі трэба звяртаць на выхаванне ў юнага чытача працоўных і ваенных навыкаў. Неабходна друкаваць матэрыялы аб геаграфічных асаблівасцях БССР, яе прыродных багаццях, аб асушцы балотаў, кок-сагызе, аб гісторыі Беларусі, змяшчаць лепшыя вершы, малюнкі, загадкі і рэбусы саміх дзяцей. Патрэба ў журнале вялікая.

Пасля абмеркавання плана работы журнала «Іскры Ільіча» на 1941 год, сход заслухаў інфармацыю аб рабоце з школьнікамі ў часе веснавых канікул. Вырашана арганізаваць спатканні тт. Маўра і Якімовіча з юнымі чытачамі ў Тэатры юнага гледача БССР.

В.





Вобраз Валерыя Паўлавіча Чкалава ў жыцці і ў мастацтве. Злева: В. П. Чкалаў на вакзале ў Вашынгтоне дае інтэрв'ю амерыканскаму рэпарцёру пасля пералёту па маршруту Масква—Паўночны Полюс—Амерыка (1937 год). Справа — кадр з фільма: Валерый Чкалаў (арт. В. Белакураў) дае інтэрв'ю амерыканскаму рэпарцёру (арт. Г. Клерынг) па прылёце ў Амерыку. Фота ТАСС.

Фільм аб Чкалаве

Кінофільм «Валерый Чкалаў» трэба аднесці да найбольш удалых спроб савецкага мастацтва стварыць поўнацэнны станоўчы вобраз перадавога савецкага чалавека.

Зусім нядаўна мы чыталі выдатны сцэнарый т. т. Байдукова, Тарасава і Чырскава «Валерый Чкалаў». У ім здзіўляла абсалютная праўдзівасць аўтараў, якія здолелі паказаць неўміручы вобраз гераічнага сучасніка ва ўсёй складанасці яго чалавечых пачуццяў, у строгім адзінстве яго перажыванняў і ўчынкаў. У вобразе, створаным маладымі сцэнарыстамі, мы ўбачылі жывога Валерыя Чкалава — неўгамоннага, смелага, усхваляванага, які ўступае ў непрымірымую барацьбу з усім косным, заляжалым, «прабабкіным». Незабыўны эпізоды развітання Валерыя Чкалава з яго камандзірам, настаўнікам і другам — лётчыкам Алёшыным, эпізоды палётаў Валерыя Чкалава і яго прыяцеляў, сагрэтых велізарнай ласкай роднай краіны, эпізоды сустрэчы і гутаркі Валерыя Чкалава з таварышам Сталіным. Ва ўсіх гэтых эпізодах дзейнічала цэльная асоба чыстай душы і адзінага ўспрыняцця свету. Чытаючы сцэнарый, мы зусім не заўважалі тых «метадаў», якімі звычайна «адцяняюць» і «ажыўляюць» станоўчы вобраз. У сцэнарыі жыве і дзейнічае чалавек адзінай волі, адзінага імкнення.

І вось на аснове гэтага выдатнага літаратурнага матэрыялу малады рэжысёр М. Калатозаў паставіў фільм «Валерый Чкалаў». Цэнтральную ролю ў фільме выконвае артыст В. Белакураў. Трэба сказаць, што ў фільме некалькі згладжаны рысы чкалаўскага характару: у іх менш той непаўторнай чкалаўскай характэрнасці, якая была ў сцэнарыі. Але тое, што стварыў Белакураў у ролі Валерыя Чкалава, павінна быць ацэнена як вялікая перамога савецкага кіномастацтва.

Валерый Чкалаў упершыню паяўляецца на экране ў некалькі непрывычнай абстаноўцы — на гаўптвахце, куды ён трапіў за парушэнне лётнай дысцыпліны. Валерый Чкалаў лётае ўверх коламі, праляцеў у пралёт маста, ганяўся за стадам перапалоханых кароў. Бязмежная юнацкая адвага патрабуе выйсця. Але ўжо ў гэтых непраўдападобных учынках бестурботнага Валерыя Чкалава вы пачынаеце адчуваць, як праступае у ім цвёрдая воля, як наспявае сапраўдная, цалкам усвядомленая мужнасць лётчыка-наватара. На самой справе, не заўсёды-ж прыйдзецца лятаць роўна і гладка, недалёка той час, калі савецкаму лётчыку прыйдзецца перамагаць велізарныя цяжкасці і перашкоды, — ці-ж можна ў такім разе цалкам падпарадкавацца законам лётнай «прыстойнасці», заставацца да канца старанным школьнікам і не больш! Не, Валерый Чкалаў ніколі не будзе лётным школьнікам, ён «выцісне» з самалёта ўсе сокі, усе яго магчымасці, ён давядзе, якія цуды можа тварыць савецкі лётчык! І заслуга аўтараў фільма, перш за ўсё артыста Белакурава, заключаецца ў тым, што яны здолелі выразіць гэта новае, жыццёвае адчуванне савецкага лётчыка-наватара ў гранічна-індывідуалізіраванай форме пачуццяў і перажыванняў жывога чалавека — Валерыя Чкалава. Праўда, справядлівасць патрабуе адзначыць, што ў параўнанні са сцэнарыем у фільме некалькі грубей дадзены душэўныя рухі героя.

Вось ён, вялікі і ласкавы, зграбае кучу кветак для свайго «другога вяселля». Усхваляваны пасля гутаркі з таварышам Сталіным, абнадзеены ў сваіх пошуках, поўны новых небывала-ясных пачуццяў, Валерый Чкалаў раптам успамінае, што ён малавата ўвагі ўдзяляе сваёй жонцы — Ользе, што ён кахаў яе не так, як гэтага заслугоўвае яго сардэчны друг. І вось яны ўдвух ідуць у сад, у якім упершыню сустракаліся маладыя, закаханыя, каб зноў перажыць пачуццё першай сустрэчы, першых прызнанняў. У гэтай выдатнай і сапраўды мастацкай сцэне вырастае задушэўны лірычны вобраз Валерыя Чкалава...

Фільм «Валерый Чкалаў» зойме адно з пачэснейшых месц у серыі біяграфічных фільмаў, якія ў апошні час паявіліся на савецкім экране.

Г. БЯРОЗКІН.

У ПРАЎЛЕННІ ССП БССР

На пасяджэнні праўлення ССП БССР 25 сакавіка абмеркаваны зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў Алеся Кучара, падрыхтаваны крытыкам да друку. Даклад аб зборніку зрабіў В. Вольскі. У абмеркаванні прынялі ўдзел тт. М. Ларчанка, Зм. Бядуля, Г. Бярозкін, М. Модэль, П. Глебка і М. Лынькоў. Праўленне ССП БССР рэкамендавала Дзяржаўнаму выдавецтву БССР выдаць зборнік Алеся Кучара пасля дапрацоўкі аўтарам асобных артыкулаў на аснове заўваг, зробленых пры абмеркаванні.

Праўленне ССП БССР зацвердзіла бюро па кіраванню прапагандай мастацкай літаратуры ў складзе тт. Стаховіча (старшыня), Глебкі і Кучара. Устаноўлен таксама тэрмін творчай канферэнцыі па драматургіі — другая палова красавіка. Дакладчыкам зацверджан т. М. Модэль. Для судаклада аб оперна-балетнай драматургіі запрашаецца праф. Солерцінскі (Ленінград).

М.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У1901. Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.